Літаратурная Беларусь

Выпуск №10 (98)
(кастрычнік)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas. info

Змест

Паміж берагамі

ГІСТАРЫЧНАЯ СВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

Ірына ХАДАРЭНКА

Адзін з найбольш вядомых парадоксаў логікі, аўтарства якога належыць Гегелю, сцвярджае: «Гісторыя навучае толькі таму, што яна ніколі так і не навучыла чаму-небудзь народы».

Гэта ў поўнай меры мае дачыненне і да беларусаў, якія ў працяглым і пакуль не завершаным працэсе станаўлення нацыі вучацца вельмі марудна, без асаблівай ахвоты, а часам і наогул ігнаруючы разнастайныя прыклады з уласнай гісторыі. Толькі выпрасталіся з кіпцюроў Расійскай імперыі — і адразу ж захраслі ў таталітарнай дрыгве Савецкага Саюза, не паспелі як след ачомацца ад нечаканага шчасця ў выглядзе здабыцця незалежнасці — і галава ўжо пнецца ў хамут ЕўраАзЭС. Але больш за ўсё выклікае здзіўленне тое, што замест пераасэнсавання гістарычных працэсаў, якога цяжка было б патрабаваць ад простых грамадзян, рэакцыя палітычных элітаў амаль нічым не адрозніваецца ад рэакцыі плебса і зводзіцца да ўпадабанай тактыкі: «А можа, так і трэба?»

Гістарычнае мысленне беларусаў можна аднесці да так званага «рэверсіўнага», якое прапануе соцыуму неадназова «наступаць на адны і тыя ж граблі», каб канчаткова пераканаць у бесперспектыўнасці вырашэння новых праблем пры дапамозе старых сродкаў.

Асаблівасці гістарычнага мыслення наўпрост уздзейнічаюць не толькі на фарміраванне гістарычнай свядомасці і трываласць гістарычнай памяці народа, але і на гістарычны выбар, які ім здзяйсняецца. І тут можна ўгледзець пэўную аналогію з тэзісам французскага культуролага К. Леві-Строса, які падзяляў грамадствы на «халодныя» і «гарачыя»; для першых уласціва «нулявая чуллівасць да гістарычнага развіцця», шанаванне стабільнасці і добраўпарадкаванасці сацыяльных стасункаў, у той час як у другіх «унутраная тэмпература няспынна змяняецца», а гісторыя становіцца чымсьці кшталту рухавіка развіцця.

Фота Дзмітрыя Брушко

Сёння сэнсавая напоўненасць канцэпту нацыянальнай ідэі па ранейшаму працягвае боўтацца паміж двума берагамі ад мы беларусы з братняю Руссю да наш народ заўсёды пакутаваў ад маскальскага прыгнёту

Адказнасць за фарміраванне гістарычнай свядомасці той ці іншай нацыі варта ўскладаць не толькі і не столькі на прафесійных гісторыкаў, колькі на пасіянарную частку грамадства, а таксама тых асобаў, якія вызначаюць кірунак культурнай палітыкі ў дзяржаве.

Калі абывацеля хвалюе пытанне асвятлення ва ўласным жытле, ён наўрад ці самастойна будзе паглыбляцца ў схемы электраправодкі, даручыўшы гэтую справу спецыялістам. Гэтак жа і гістарычная памяць (існаванне абсалютнай аб'ектыўнасці ў якой наогул можна паставіць пад вялікі сумнеў, бо кожны з аўтараў гістарычных канцэпцый так ці інакш дзейнічае ў межах пэўнага ідэалагічнага ракурсу) — закліканая выступаць інструментам мацавання нацыянальнай свядомасці, яна рэдка засяроджваецца на дэталях, аддаючы перавагу разуменню агульнай карціны падзей мінуўшчыны. Апошняя, у сваю чаргу, малюецца фарбамі, змешчанымі ў палітры, створанай дзяржаўнымі інстытутамі разам з грамадзянскай супольнасцю.

Значна ўплывае на дзейсную сітуацыю і тое, што мноства гісторыкаў насамрэч стварае не столькі летапіс сапраўдных падзей, колькі калянавуковае фэнтэзі. Напрыклад, апалагеты лозунга «Расія, Украіна, Беларусь — усё гэта Святая Русь» часта ў якасці абгрунтавання сваёй апантанасці абапіраюцца акурат на факты «агульнай» гісторыі. У айчынных рэаліях прыходзіцца міжволі канстатаваць, што ў галіне шчыльнага «супрацоўніцтва» з гісторыкамі адэпты заходнерусізму, якія наогул варта было б прыраўняць да экстрэмізму або нават сектанцтва, значна апярэджваюць тых, хто спрабуе прадстаўляць грамадскасці нацыянальна-арыентаваны падыход да гістарычнай спадчыны.

Плён дзейнасці імперскіх ідэолагаў, нібы нафтавая пляма, актыўна распаўзаецца па медыяпрасторы, ствараючы адпаведны эфект у масавай свядомасці. Значнасць такіх падзей, як Грунвальдская бітва або бітва пад Оршай, наўмысна змяншаецца, каб увесь прапагандысцкі імпэт скіраваць на перамогу ў Другой сусветнай вайне і далейшай пабудове дзяржаўнасці пад «чулым кіраўніцтвам» з боку «старэйшага брата». Не кажучы ўжо пра тое, што ў Беларусі няма месцаў памяці, дзе чалавек мог бы ўзгадаць пра дзеячаў Беларускай Народнай Рэспублікі, якія шмат рабілі дзеля таго, каб наша краіна была незалежнай. Таксама ў Мінску адсутнічае помнік Кастусю Каліноўскаму, прызнанаму на дзяржаўным узроўні яшчэ ў савецкія часы. Няма ў Беларусі манументаў і дзеячам БССР, нацыянал-бальшавікам Зміцру Жылуновічу і Аляксандру Чарвякову, якія спрычыніліся да абвяшчэння Савецкай Беларусі, адыгралі выключную ролю ў палітыцы беларусізацыі ў 1920-х гадах. Замест гэтага мы маем мноства помнікаў «сакральнай каровe» камуністычнай ідэалогіі — Леніну.

Сталічныя кіраўнікі дагэтуль не могуць (ці хутчэй, не хочуць) усталяваць годны мемарыяльны комплекс у Курапатах або прынамсі забяспечыць належную ахову тэрыторыі, але затое яны ахвотна гатовыя — за велізарны замежны грант, вядома — далучыцца да маштабнага перайтварэння месца памяці ў вёсцы Малы Трасцянец, дзе нават немагчыма ўстанавіць дакладную колькасць ахвяраў (пераважна пахаваных, дарэчы, зусім не там, а побач, на месцы цяперашняга гарадскога сховішча смецця). Апроч таго, у апошнія гады пайшла завядзёнка паўсюдна ўзводзіць помнікі прадстаўнікам рускай праваслаўнай царквы. Прычым на адкрыцці гэтых помнікаў, як правіла, прысутнічаюць і радасна пляскаюць у далоні тыя, хто яшчэ ўчора бавіў час на сходках камсамольскіх актываў, быў непрыхаваным атэістам і актыўным барацьбітом з «рэлігійным цемрашальствам».

Таму не дзіўна, што сёння сэнсавая напоўненасць канцэпту нацыянальнай ідэі па-ранейшаму працягвае боўтацца паміж двума берагамі: ад «мы, беларусы, з братняю Руссю» да «наш народ заўсёды пакутаваў ад маскальскага прыгнёту», а становішча з нацыянальна-арыентаванай беларускай элітай трапна акрэслена Сяргеем Дубаўцом: «сем суполак па сем чалавек». Усеабдымны посткаланіяльны цень на гістарычнай свядомасці большасці суайчыннікаў перашкаджае ганарыцца тым, што менавіта нашы продкі былі першапачынальнікамі партызанскага руху, вынаходнікамі шматступеннай ракеты і рэактыўнай авіяцыі, заснавальнікамі магутнага прататыпу Еўрапейскага Саюза ў выглядзе ВКЛ, фундатарамі аднаго з найстарэйшых у свеце запаведнікаў «Белавежская пушча», стваральнікамі сарматызму і супрэматызму ў мастацтве.

Святкаванне 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў рэзка кантрастуе з поўнай адсутнасцю цікавасці да 500-годдзя бітвы пад Оршай з боку афіцыйных структур. Яно і зразумела: гэтая дата вельмі «нязручная» для гістарычнага іміджу ўсходняга суседа, які прызвычаіўся з кожнай шчыліны крычаць пра свае вялікія перамогі і адначасова «забываць» пра не менш вялікія паразы. І ў гэтым прасочваецца непрыхаваны і досыць сур'ёзны выклік для нас, беларусаў. Бо пакуль мы будзем з мазахісцкай радасцю працягваць эксплуатаваць вобраз надзвычай памяркоўнага народа, які выжыў у мностве войнаў і вытрымаў шмат гора і пакут, — жыць па-сапраўднаму, з годнасцю, вольна і на поўную моц наша краіна будзе хіба толькі ў папулярным і, што таксама сімвалічна, фактычна забароненым сёння заклiку: «Жыве Беларусь!».

Сустрэча ў школе № 144

Ульф Нільсан і маленькія беларусы

«Я баюся акулы», «Я баюся цемры», «Я баюся вышыні», «Я баюся заставацца адна дома» — васьмі-дзевяцігадовыя маленькія беларусы прызнаваліся шведскаму пісьменніку Ульфу Нільсану ў тым, што палохае іх найбольш, і малявалі пра гэта малюнкі, каб перамагчы свае страхі...

Ульф Нільсан – дзіцячы пісьменнік, аўтар кнігі «Найлепшы спявак у свеце», якая нядаўна выйшла па-беларуску ў серыі СБП «Каляровы ровар». Кніга расказвае пра тое, як хлопчык навучыўся не баяцца выступаць на сцэне. Ульф часта працуе са складанымі тэмамі ў сваіх кнігах, страх — адна з іх. Паразумецца з беларускімі чытачамі дапамагала аўтару перакладчыца кніжкі са шведскай Алеся Башарымава.

Сустрэчы, арганізаваныя Саюзам беларускіх пісьменнікаў, прайшлі другога і трэцяга кастрычніка ў 144-й школе у Соснах, Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы і ў Заслаўскай гімназіі. Іх мадэратарам выступіла беларуская дзіцячая пісьменніца Алена Масла.

Разам з Ульфам Нільсанам у Мінск прыехала прадстаўніца Шведскага саюза пісьменнікаў Ан Вікстром. Дзеці і госці задавалі адно аднаму пытанні, гаварылі пра кніжкі, пра тое, як бавяць дзень малодшыя школьнікі ў Швецыі і Беларусі, і нават спявалі песні.

Беларускім чытачам Ульф расказаў пра тое, як працуюць пісьменнікі і як можна самім зрабіцца пісьменнікам, склаўшы кніжку з малюнкамі.

Калі не вялікую, то маленькую, хаця б зусім-зусім маленькую.

На памяць пра сустрэчу ў Соснах Ульфу падарылі малюнкі з выставы паводле ягонай кнігі.

Затым у памяшканні кнігарні «Галіяфы» прайшла сустрэча Ульфа Нільсана з беларускімі пісьменнікамі і перакладчыкамі, прысвечаная стану дзіцячай літаратуры ў Швецыі і Беларусі, яе ролі ў грамадстве, супрацы пісьменнікаў са школамі, а таксама складаным тэмам у літаратуры для дзяцей. З беларускага боку ўдзельнічалі Раіса Баравікова, Алеся Башарымава, Вольга Гапеева, Надзея Кандрусевіч, Алена Масла, Серж Мінскевіч, Барыс Пятровіч, Алесь Пашкевіч, Аксана Спрынчан. Мадэравала сустрэчу Юлія Цімафеева.

Алена Казлова

Алеся Башарымава і Ульф Нільсан

ЛІСТАПАДАЎСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

Аляксандр Іосіфавіч Фядута (нар. 03.11.1964)
Алесь (Аляксандр) Пятровіч Рыбак (нар. 07.11.1934)
Міхаіл Аляксеевіч Карпечанка (14.11.1959)

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!



Паседжанне Рады СБП

Адбылося чарговае паседжанне Рады ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў». На ім былі разгледжаны заявы кандыдатаў на ўступленне ў пісьменніцкую арганізацыю.

На паседжанні прысутнічалі сябры Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў і кіраўнікі яго абласных аддзяленняў. Была абмеркавана падрыхтоўка літаратурных альманахаў «Ратуша» (Віцебск), «Жырандоля» (Берасце), «Палац» (Гомель), «Новы Замак» (Горадня) і «Брама» (Магілёў), а таксама разгледжаны іншыя пытанні дзейнасці абласных аддзяленняў.

Быў заслуханы даклад, зроблены па выніках сацыялагічнага даследавання, прысвечанага маніторынгу культуры чытання ў Рэспубліцы Беларусь.

Паводле тайнага галасавання сябрамі Саюза беларускіх пісьменнікаў сталі Мікалай Аляхновіч, Мікола Мілаш, Іван Сачук і Сяргей Шапран.

Мікалай Аляхновіч нарадзіўся 14 студзеня 1953 года ў вёсцы Валішча Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1974). Лінгвіст, кандыдат філалагічных навук (1983), дацэнт. За час працы на факультэце працаваў намеснікам дэкана, дэканам філалагічнага факультэта, у 1993—1995 гг. працаваў на кафедры ўсходнеславянскай і балтыйскай філалогіі факультэта гуманітарных навук Будапешцкага ўніверсітэта імя Лоранда Этвеша (Венгрыя). З ліпеня 2013 года — дацэнт на кафедры беларускага мовазнаўства і дыялекталогіі БрДУ імя Пушкіна.

Займаецца навукова-даследчыцкай і літаратурнай дзейнасцю. Аўтар вершаваных зборнікаў «Жыццёвае веры прадзіва» (2006), «Святло дарогі» (2010), кнігі перакладаў «Такая тонкая размовы ніць» (2013).

Мікола Мілаш (сапр. Мікалай Лазаравіч Шаравар) нарадзіўся 26 снежня 1936 года ў вёсцы Дамантовічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Мінскі лесатэхнічны тэхнікум (1958). Пасля службы ў арміі вучыўся ў Ленінградскай лесатэхнічнай акадэміі, скончыў вячэрні ўніверсітэт пры Петразаводскім лесатэхнічным тэхнікуме. У 1968 годзе вярнуўся ў Беларусь, у Салігорск, дзе жыве і па сёння.

Аўтар шасці кніг: «На хвалі Адраджэння» (2009), «На скрыжалях часу» (2011), «На ветразях Хрыстовай веры» (2011), «У пошуках Арыяднінай ніці» (2013), зборніка паэзіі і некалькіх навуковых трактатаў.

Іван Сачук нарадзіўся 5 мая 1937 года ў вёсцы Буда Казіміраўская Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Мазырскае педагагічнае вучылішча. Працаваў настаўнікам у Лельчыцкім раёне. У 1956 годзе стаў студэнтам юрыдычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ламаносава. Працаваў выкладчыкам у ВНУ Украіны, вярнуўся на радзіму.

Выкладаў у Мазырскім універсітэце. Дацэнт кафедры гісторыі і паліталогіі, кандыдат гістарычных навук. Цяпер на пенсіі, жыве ў Мазыры. Аўтар кнігі «Цяплом душэўным падзялюся», падрыхтавана да друку кніга «Крыніца бабы Марты».

Сяргей Шапран нарадзіўся 11 лютага 1968 года ў Рызе (Латвія). Скончыў філалагічны факультэт (аддзяленне расійскай мовы і літаратуры) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1992). Яшчэ падчас вучобы пачаў займацца журналістыкай, любімы жанр — інтэрв'ю. Друкаваўся ў перыядычных выданнях: «Советская молодёжь», «Час», «Суббота» (Рыга); «Знамя юности», «Имя», «Белорусская деловая газета», «Новы Час», у часопісах «Дзеяслоў», «Абажур» і іншых.

У апошнія гады займаецца даследаваннямі жыцця і творчасці Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, а таксама Уладзіміра Някляева.

Атрымаў дыплом Саюза тэатральных дзеячаў (2000), прэмію «За ўнёсак у развіццё беларускай рок-музыкі» (2007). Лаўрэат прэміі імя Алеся Адамовіча за даследаванне «Васіль Быкаў. Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах» (2011).

Прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў

Сустрэча з Іванам Мельнічуком

У Берасцейскай гарадской дзіцячай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адбылася творчая сустрэча з пісьменнікам Іванам Мельнічуком.

Дзеля гэтага было аж тры пачэсныя нагоды: прэзентацыя дзіцячай кнігі «Чудеса в решете», зборніка «Гасцінец» і, таксама, святкавання 75-гадовага юбілею старшыні Берасцейскай філіі СБП.

Месца сустрэчы было абранае не выпадкова: Іван Мельнічук найперш вядомы землякам менавіта як аўтар твораў для маленькіх чытачоў. Выдаўшы першую кнігу «Кто разбудил солнце» аж у 1982 годзе, Іван Міхайлавіч працягваў сваю плённую працу і да сёння стаўся стваральнікам амаль дзясятка кніг для дзяцей. Зборнік «Гасцінец», наадварот, стаўся першай недзіцячай кнігай паэзіі, якая ўтрымлівае сярод іншага прысвячэнні сябрам, жарты, гумарэскі — вершы, што падтрымліваюць светлы настрой, уласцівы творчаму почырку аўтара.

На пачатку гасцям сустрэчы прадэманстравалі дакументальны фільм Берасцейскай абласной студыі тэлебачання, што быў зняты да 70-годдзя Івана Мельнічука.

Імпрэзу адкрыла дырэктар Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Берасцейскай вобласці, дэпутат абласнога савета Святлана Сямашка, якая падзякавала юбіляру за яго шчырую працу на ніве дзіцячай літаратуры ад імя землякоў.

Ад імя Саюза беларускіх пісьменнікаў з віншаваннямі выступілі старшыня ГА «СБП» Барыс Пятровіч і намеснік старшыні Алесь Пашкевіч. У дар бібліятэцы былі перададзеныя дзіцячыя кнігі з новай серыі «Каляровы ровар», запачаткаванай СБП.

Да віншаванняў далучыліся калегі па філіі Леанід Філатаў, Алесь Каско, Мікола Сянкевіч, а таксама родныя і сябры Івана Міхайлавіча.

Напрыканцы імпрэзы сп. Мельнічук падзяліўся жыццёвымі назіраннямі ды творчымі планамі, выказаў падзяку сябрам-пісьменнікам і ўсім прысутным гасцям.

Схіліўшыся над мурашнікам

Ты не забыты

10 гадоў назад ад нас пайшоў у паэтычную беларускую вечнасць Мікола Купрэеў.

Пакутны самотнік, ён займеў па сабе людскую памятку — уласны помнік на магіле ў Івацэвічах, які стаў магчымым дзякуючы павазе паэта і пчаляра з Лінёва Міколы Папекі і журналісткі Пружанскай раённай газеты Ганны Хадаровіч да Міколы Купрэева, мастака Юрыя Малышэўскага — да Хадаровіч ды Папекі, дырэктара Брэсцкага рытуальнага завода (дзе і быў куплены шыкоўны камень на магілу паэта) — да беларускіх пісьменнікаў увогуле. Сродкі на помнік збіраліся сярод прыхільнікаў творчасці і сяброў Міколы Купрэева. Народны майстар Юрый Малышэўскі ахвяраваў свой час на выгатаўленне помніка і барэльефа на камяні.

Памятаем, Мікола, твае шчымліва-развітальныя словы: «Б'юць з нябёсаў званы беларускіх цэркваў — толькі яны й жывыя, і ў іх апантаным звоне я, чырвонай халоднай вадою напоўнены, чую крык маёй колішняй роднай мовы, чую ціхае ў звоне высокім маленне нашай вечнай Жанчыны Полацкай.

Дайце дарогу, браты-чарвякі, прапусціце, стаміўся — паўзу я спачыць у нетры пад роднае Ямнае».

Не дапоўз да бацькаўшчыны, на жаль... Лёг пад маладым дубам у Івацэвічах.

Спадзяёмся, што і там будзе яму пухам зямля.

Ты не забыты...

Амаль шэсцьдзясят гадоў Міколу Купрэева мала хто ведаў і асабліва ніхто ў гэтым свеце не ўспамінаў. І во, раптам, схамянуліся: не стае, як высветлілася, у нашай літаратуры аднаго чалавека, і трэба ж так стацца, што менавіта яго — Купрэева.

Дажыўся, што й казаць...

Аднак лічба яго ўзросту здаецца наўмысна завышанай. Купрэеву — сорак, хочацца паспрачацца мне, бо дваццаць гадоў нармальнай творчай працы ўкралі ў яго савецкія чыноўнікі і, падобныя да іх, савецкія беларускія пісьменнікі...

Выдаўшы яго зборнік вершаў, з празорлівым да ўласнага лёсу назвам — «НЕПАЗБЕЖНАСЦЬ», яшчэ ў 1967 годзе, яны адначасна адсунулі аўтара і ад Саюза пісьменнікаў, і ад сталіцы — туды, на палескую перыферыю, — і забыліся...

А сёння вось як бы ўспомнілі і, радняволя, дадаюць яму тыя дваццаць пакутна-вандроўных гадоў адзіноты і ўнутранай эміграцыі.

«Шэсцьдзясят, — кажуць, — табе, Мікола! Віншуем з пенсіяй...»

«Дзякуй», — адказвае Мікола. Ён — беларус, а значыць, чалавек не злапомны і памяркоўны.

Ну і лады, здавалася б, чаго між людзей ні бывае, — усё травой зарастае...

Аднак сённяшні час паказвае, што гэта не зусім так.

Ну не ўпісваўся дарэшты Купрэеў у той афіцыйны літаратурны гурт, хоць ты плач...

Анягож! Нейкага нерытмічнага пішучага бадзягу з Белавежскай пушчы зноў былі дапусцілі да казённага, хоць ужо й не надта хлебнага стала, а ён, не паспеўшы паабцерціся, — адразу ж да лаўраў!..

Таму, як і раней, цішком-употай зноў былі адсунулі Міколу Купрэева ад чарговага дзяржаўнага «кавалка». І як адмыслова ўсё зрабілі: галасы яму ў Дзяржкамітэце па прэміях аддалі, маўляў, мы за цябе ўсёй душою, — і не наша тут віна, што ў апошнюю хвіліну вышняя рука выкрэсліла цябе са спіса... На ўсё воля Божая... Відаць, целам не выйшаў ці душок не той, потам пахнеш ці кашуля нямытая...

Ёсць дзве катэгорыі пісьменнікаў. Адныя жывуць з таго часу, у якім жывуць, па негалосным прынцыпе Петруся Броўкі: міне твой час, «ападзе грэбень — і на х.. ты каму патрэбен...»

Купрэеў адносіцца да літаратараў другой катэгорыі, да тых, якія жывуць сваім часам.

І, перш чым пачынаць гэтую блытаную і не да канца вызначаную размову пра жыццё і творчасць Міколы Купрэева, хочацца, як эпіграф да гэтай часткі, працытаваць радкі з верша не менш таленавітага, але й не менш адрознага паэта Леаніда Дранько-Майсюка:

Даволі вярэдзіць раны!
І без таго заўважаю —
глядзяць, як на эмігранта,
на мяне, калі размаўляю.
Адкуль? З якой рэзервацыі?
З якой Беларусі такой?
Эх, вечная эміграцыя
на радзіме сваёй.

Не пакідаючы межаў радзімы, Купрэеў, дзе змушана, а дзе ўсхілку свайго характару і паводзін, эмігруе ў самога сябе. Ён пачынае жыць у межах сваёй душы і ўласнага розуму. Акаляючая прырода і прырода самабытнага таленту вадзілі яго па высыхаючым меліярацыйным Палессі без малога сорак гадоў, як Майсей іудзейскі народ па Аравійскай пустэльні...

Гэты бясконцы шлях можна назваць бязмэтным, як бязмэтны ў жыцці і ў сутнасці сваёй творчасці сам Мікола Купрэеў, — як, у рэшце рэшт, бязмэтная і сама прырода.

Ён аўтар тэкст
і кантэкст свайго жыцця
У літаратурах свету
такіх няшмат У сучаснай
беларускай літаратуры
Купрэеў бадай адзіны
хто безаглядна
бескарысліва
і бясслаўна скормліваў
сваё жыццё
творчасці

...Сухастой, гнілле і карабельныя сосны, мухаморы, паганкі і баравікі, выспы, балоты і хлебадайны чарназём, — усё гэта ёсць і сродкам, і вынікам, і прычынай ТАГО жыцця і ТОЙ творчасці.

Хто чытаў дзве, блізкія да аўтабіяграфічных, аповесці-споведзі Купрэева («Дзіцячыя гульні пасля вайны» ды «Імгненне светлае...»), напэўна, заўважыў, што аўтарскае «я» там не вытыркаецца — не геразуецца — а стаіць як бы «па-над» і «наводдаль» — сузірае, але не ацэньвае, не судзіць, не асуджае... Бо — КАГО? Бо — за ШТО? СЯБЕ-НАС? За тое, што ёсць як ёсць, што жывём?

Прырода не мяняе сваёй глыбіннай сутнасці ні падчас праліўных дажджоў, ні падчас засухі, ні падчас землятрусу — ні вясной, ні зімою...

Яна ёсць, і мы павінны змірыцца з тым, якая яна ёсць, і шукаць і знаходзіць паразуменне з яе праявамі ў сваёй душы.

Нярэдка — халодны і галодны — Купрэеў піша пра холад і голад гэтай самай чалавечай душы... на каленях, на камянях, на падваконнях, на бальнічных тумбачках, у вузкай і затхлай пяржаўленай ваннай тубдыспансера, на векавым дубовым пні Белавежскай пушчы...

Напісаныя ім словы — вузлаватыя і сухія, як хруст леташняга галля пад нагамі, то працяглыя і ліпка-смалістыя, як рэха, што адгукаецца толькі таму, хто кліча, то вуркатліва-іранічныя, як вада ў раўчуку...

У яго словах няма ўзроставага маразму і павучання. І гэты голас заўжды новы, як вясна. Ён можа быць сцюдзёным альбо цёплым, але — заўжды ўласным.

У сваіх тэкстах, як у акварыуме, ён захоўвае сваё ўнутранае духоўнае жыццё, але не кансервуе яго, як спажытак, а падкормлівае назапашанымі крышынкамі быцця, што засталіся ў ветраных кішэнях пасля чарговай вандроўкі ў людскі свет...

Ён не песіміст і не аптыміст, больш таго, нават не рэаліст. Купрэеў пэўны ў НЕПАЗБЕЖНАСЦІ чалавечага лёсу і, як загнаны воўк, упарта мкне па цаліку, не зважаючы на пераслед... таго ж лёсу...

Як той воўк — ён, гнаны непадуладным духам усяіснага часу, ехаў і едзе беларускім шляхам па зачараваным коле дзяржаўнай чыгункі... У яго не было й няма ні дарожных квіткоў, ні канцавых станцый... Едучы, ён не бачыць дарогі, а жыве наўзбоч яе, углядваючыся ў прастору, што прамінае за вокнамі помных вачэй... І едзе ён з намі ў адзін бок, але паасобна ад нас...

Ніхто не ведае, як яму было аднаму. Бо — не жаліўся, неназаляў рукапісамі, не засціў свет у літфондаўскіх чэргах, не лаяў людзей, не прасіў начлегу, не набіваўся ў сябры, па сутнасці, не меў сям'і, хоць фактычна яны былі...

У яго не было ні сваёй хаты, ні свайго пэўнага месца на зямлі. Як ніхто іншы, ён апраўдваў баптысцкі перафраз: мы не дома — мы ў гасцях... Купрэеў — госць. Гаспадаром ён ніколі й не быў, нават гаспадаром сваіх рукапісаў...

Ён — аўтар, тэкст і кантэкст свайго жыцця. У літаратурах свету такіх няшмат. У сучаснай беларускай літаратуры Купрэеў, бадай, адзіны, хто безаглядна, бескарысліва і бясслаўна скормліваў сваё жыццё творчасці. Далёка не кожны, нават вялікі, талент здольны прынесці сябе ў ахвяру слову. Ды й не ад нас гэта ўрэшце залежна. Тут трэба нарадзіцца як бы неданошаным, каб увесь час памятаць пра гэта і мецць пожад даносіцца да сваёй чалавечай пэўнасці ў лоне боскай прыроды, адчуваючы сваю веслую, лёсам дадзеную, ушчэрбнасць, як наканаванае табе НЕШТА...

Неад'емнасць новых пошукаў і адкрыццяў у такіх творцаў гарманічна нітуецца з класічнай традыцыяй. Яны шукаюць вечнае не на пустым месцы, але пустое месца тым засяваюць...

...Мне здаецца, што гэтай парой ён зноўку стаіць недзе ў гушчары Белавежскай пушчы, звесіўшы на кульбаку сваю ссівелую і свежую ад расы галаву, над мурашнікам, і сочыць за мітуслівай мурашынай валтузнёй, за іх спрадвечным бытаваннем. Мітусяцца, томяцца мурашы, цягаючы хвойныя ігolкі... І сцежкі ў іх усё тыя ж: пакручастыя, і архітэктура мурашніка ўсё тая ж: надземная і ўзвышаная... Юдзіць зазірнуць у нутро — што там ды як? Але — дазнаўшыся, разбурыш... Няхай поўзаюць, няхай жывуць, — у гэтым іх сэнс і сутнасць існавання...

Як проста і як геніяльна! Туды-сюды, сюды-туды... дакладна адлічваючы імгненні вечнасці — іголка да іголкі, ад першай да...

І раптам яго позірк засяродзіцца на адным з іх, самым бяспечным і маладым, што скіне сваю ношу пры самым уваходзе ў дом-мурашнік і нечакана скіруе далёка за межы «страны муравии»; падпаўзе да самага наска ўношанага чаравіка Купрэева і пачне ўзбірацца на яго высокую вяршыню, забыўшыся пра ўсё, апантаны адно толькі інстынктам ды прагай спазнання самога сябе і таго, што перад ім паўстала...

— Ну, куды ты, брат?..
....
— Назад, назад кіруй у свой мурашнік...
....
— Які неслух!..

І няўзнак яны паразумеюцца і пасябруюць...

Прысвячаючы Янку Брылю верш, што адкрывае неўлаўрэачаную Дзяржаўнай прэміяй другую кніжку «Правінцыйныя фантазіі», Мікола Купрэеў, хочучы таго ці не хочучы, напісаў сабе прыжыццёвую эпітафію.

Косю мой, косю,
дзе ты блукаў-лятаў?
Дзе ты якія землі
капытамі таптаў?
....

Косю мой, косю,
за намі ідуць —
напэўна, у Гродна
тыграм павязуць.
Як будуць вясці нас
па роднай мяжы –
каб людзі не чулі,
мой конь, не іржы.
Косю мой, косю...

«...Ведаеш, які народ тут — амаль адны бамжы ды былыя зэкі. Імі забітыя ўсе палаты. Ванную адчыняюць толькі ў «банныя» тры дні — да вечара. Не пачытаеш па-людску, не папішаш... Бывае, дыхаць няма чым на зямлі нашай, нават у правінцыях — маіх колішніх «палесцінах»... Ды ну Вас усіх у Менску!.. Колькі мне гэты Менск (здаецца, ён — «сталіца» Беларусі?) папсаваў нерваў... І тут — хоць ты ў нару якую хавайся ці ў бярлогу... Ты пішаш мне: «жыві, пішы, твары, не раскісай»... Не, Лёня, ты ўжо там сам у сваёй сталіцы і жыві, і пішы, і твары, і не раскісай... А мы, гэткая навалач, прыблуды ў гэтым свеце, можа, як-небудзь яшчэ ўпадзём, як пацяплее, у мох пад сасной ці елкай — з гэтымі яшчэ можна жыць...» (З ліста да мяне ад 11.03.97г., тубдыспансер, вёска Вярховічы).

— Косю мой, косю...
— Які неслух...
....

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Паэт, як вір…

Прайшло 55 гадоў з таго часу, як 26 кастрычніка 1959-га ў вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і Марыі й Ціхана Сысоў нарадзіўся сын Анатоль. Нарадзіўся, каб праз трычатыры дзесяцігоддзі свайго жыцця зыркай каметай праляцець па беларускім паэтычным небе, згарэць даастатку — і стаць легендай нацыянальнай літаратуры.

Гэтая старонка «Літаратурнай Беларусі» — адна з пялёсткаў у вянок яго вечнай памяці…

Паэт з босай душой*

Рыгор БАРАДУЛІН

Анатоль Сыс быў настолькі геніяльным, настолькі непасрэдным, што ён проста не змог ужыцца ў атмасферу горада. Горад усё-ткі каварны і не шчыры. Да таго ж, ён не нацыянальны. Таму такому, як Сыс, немагчыма было тут ужыцца. Горад, час яго з'еў. З'еў сваёй атмасферай. У горадзе трэба быць калючым вожыкам, трэба мець панцыр, а Сыс быў без усялякага панцыра. Ён прыйшоў у гэты халодны, калючы горад з босай душой. Таму так і выйшла…

Ён быў найвыдатнейшы паэт. І чалавек дужа далікатны. Гэта ж ён падараваў мне старажытныя іконы, хоць здавалася б — Сыс і такі… На пахаванні Васіля Быкава ўсе ад яго шарахаліся, а ён падыходзіць да мяне: «Дай мне значок з «Пагоняй»». — «Калі ласка», — кажу. У адказ ён дзякуе і — усё на гэтым…

Ён быў зганяны і застрашаны. Яго наўпрост спаілі. Спаілі, таму што баяліся канкурэнцыі. Ён жа прыехаў у Мінск дужа даверлівы, дужа шчыры. Лёс Сыса можна ў нечым параўнаць з лёсам Ясеніна, які таксама прыехаў дужа адкрыты і якому таксама памагалі піць. Але ўсім таленавітым хлопцам памагаюць піць — тыя, якія больш бяздарныя.

Гэта была яркая асоба. Анатоль Сыс застанецца ў беларускай паэзіі і ў гісторыі беларускага духу. Тут можна правесці хоць і ўскосную, але такую паралель: Сыс, як і Максім Багдановіч, пражыў хай і мала, аднак таксама асвятліў свой шлях. Ён, відаць, ішоў сваёй сцежкай у промнях Багдановіча. Гэта калі сыходзіць з яго шчырасці, з яго беларускасці.

Анатолю Сысу прысвяціў я верш:

Як вір…

Паэт, як вір,
Ад хвалявання стыне,
На дне хаваючы халодны клёк.
З гародчыка расчульвання
Юргіня
Юрыць паэтаў юр,
Як неўзнарок.

Паэт, як вір,
Віруе ды шчыруе,
Перамывае родных славаў
Жвір,
З Пегаса збрую
Скідвае старую,
Бярэтку поўні
Збіўшы набакір.

Паэт, як вір,
Супернік неспакою,
Капрызны хрэснік
Шчырай Каляды.
З Сусвету,
Як з цяснюткага пакоя,
Ірвaецца вымкнуцца.
Але куды?

***Друкуецца ўпершыню.**

Прарок свабоды і незалежнасці

(Гісторыя юнацкага архіву паэта)

Алесь БЯЛЯЦКІ

Жалезныя дзверы і ваконныя краты густа засхінуты жалезнымі гарызантальнымі палосамі, якія ласкава называюць «раснічкамі», за імі ў шчыліны праглядаецца распілаванае бяздоннае неба і белыя ватныя аблокі.

Колькі разоў ужо, стоячы ля вакна і ўглядаючыся ў заманлівую сінечу неба, я паўтараў сам сабе: «Вось воблака, сяду і ў свет палячу!» Калі не целам, дык думкамі і душою. І ёсць у гэтым маім пісанні вышэйшы сэнс, бо душа мая зараз дакладна наладжаная ва ўнісон Анатолевым вершам. І хто ж, як не ён, навучыў мяне некалі шанаваць свабоду і даражыць ёй. Гэтае ягонае ўнутранае і вонкавае разняволенне, незалежнасць, якія праяўляліся і ў штодзённых паводзінах, і ў стасунках з людзьмі, натуральна пераходзілі ў ягоныя вершы. За гэта мы шанавалі Анатоля, за гэта яго не любілі людзі абмежаваныя і залежныя.

Падчас аднаго са штогадовых паэтычных святаў у гонар Анатоля Сыса на радзіме паэта ў вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёна я і зямляк Анатоля паэт і журналіст Сяржук Сыс даведаліся ад роднай сястры Анатоля Тамары Ціханаўны пра існаванне неразабранага архіву Анатоля Сыса. Падчас прагляду яго я заўважыў невядомыя вершы паэта. Для нас гэта было моцнай неспадзяванкай, неверагодным сюрпрызам, у які з першага разу цяжка было паверыць, бо Анатоль, жывучы ў Менску, неаднойчы распавядаў пра тое, што спаліў свае юнацкія вершы. Хаця, ведаючы нястрымную ахвоту Анатоля да розных жартаў і розыгрышаў, я мяркую, што гэтая містыфікацыя якраз і была ў ягоным стылі… Перабіраючы друкапісы і рукапісы, мы канчаткова пераканаліся, што перад намі вершы, пароды і пераклады, большасць з якіх мы некалі чулі з вуснаў Анатоля Сыса ў нашыя юнацкія студэнцкія гады.

Асобна ў невядомай спадчыне паэта можна вылучыць машынапіс зборніка вершаў пад назовам «Берагі майго юнацтва» (іншая верагодная назва — «Манускрыпт майго юнацтва») з раздзеламі «Бераг правы» і «Бераг левы». Зборнік складаюць творы, напісаныя Анатолем Сысом падчас вучобы ў Гомельскім універсітэце ў канцы 70-х, пачатку 80-х гадоў.

Анатоль Сыс адсылаў свой зборнік на рэцэнзію. Захавалася частка канверта з пячаткаю Саюза пісьменнікаў Беларусі, з чаго можна зрабіць выснову, што зборнік дасылаўся менавіта туды. Падрыхтаваная рэцэнзія, якая таксама знайшлася ў архіве, была адмоўнаю. Гэта, мабыць, і паслужыла прычынаю, чаму тыя вершы патрапілі ў тумбачку бацькоўскай хаты паэта. Толькі два вершы адсюль пазней былі апублікаваныя ім.

Чытаючы знойдзеныя вершы з вышыні сённяшніх гадоў, а іх мінула ўжо больш за трыццаць, я пераканаўся, што большасць з іх з'яўляюцца самадастатковымі, высокавартаснымі творамі. А яшчэ складаючы ў 2009 годзе зборнік выбраных вершаў А. Сыса «Алаіза», які рыхтаваўся да 50-х угодкаў паэта, я моцна шкадаваў, што так мала было вядома ранніх твораў Анатоля. Бо не зусім зразумелым быў для чытача шлях развіцця ягонага магутнага таленту. І мала для аэнсавання гэтага шляху ўспамінаў і нататкаў знаёмых і сяброў. Што можа сказаць пра паэта выразней, чым ягоныя першыя вершы?

Апроч гэтага машынапіснага зборніка, у паперах таксама была частка рукапісных вершаў Анатоля, у прыватнасці, вянок санетаў, напісаны ім ва ўніверсітэцкія гады. Увага да вершаванай формы санета ішла ў Анатоля Сыса ад захаплення творчасцю Максіма Багдановіча. Недарэмна ён пісаў курсавую працу, прысвечаную санету як паэтычнай форме ў творчасці М. Багдановіча. Гэтая праца з вершам-прысвячэннем М. Багдановічу таксама захавалася ў архіве. Анатоль Сыс вучыўся ў свайго «старэйшага брата» — так ён называў пазней М. Багдановіча — працаваць са словам. 14 радкоў санета ўяўляліся яму ідэальнай формай для паэтычных практыкаванняў, для шліфоўкі слова і адточвання рыфмы і думкі. Я памятаю, як ён ганарыўся сваім вянком санетаў, гаворачы пра тое, што гэта вельмі складаная форма вершаскладання і што ў беларускай паэзіі на той час было толькі два вянкі санетаў…

Вялікі ўплыў на станаўленне паэтычнага таленту Анатоля Сыса аказала насычаная філасофскай думкаю паэзія Алеся Разанава. Недарэмна бліскучая «Балада-прысвячэнне маці» пачынаецца з эпіграфа — радка з верша А. Разанава: «Да гарызонта даляцела птушка». Гэты радок паслужыў штуршком і асноўнай супярэчлівай ідэяй балады. Зыходзячы з рацыянальнага асэнсавання свету, немагчыма дапяць да гарызонту. І калі гэта ўсё ж удаецца — тады адбываецца цуд. Менавіта там, за гарызонтам, па ўяўленні паэта, птушка пераўтвараецца ў чалавека. Птушка-чалавек — гэты паганскі, родавы, татэмны вобраз заўжды прыцягваў паэта. Вобраз птушкі ўяўляецца яму абсалютным вобразам свабоды. Там, у небе — «крылы» і «музыка нябеснага прастору», а тут, на зямлі — «немач рук» і «прыцягненне вечнае зямлі».

Вобраз маці з'яўляецца культавым вобразам, які праходзіць праз усю творчасць Анатоля Сыса. Вось і ў «Баладзе…» птушка пераўтвараецца ў маці. Такім чынам, паэт назваў сябе сынам жанчыны-птушкі, уяўныя будучыя дзеці якога таксама будуць дзецьмі-птушкамі.

Гэтаксама ў архіве паэта захаваўся сцэнар радыёперадачы, прысвечанай ягонай творчасці, падрыхтаваны ўвесну 1984 года для Гомельскага радыё пасля ягонага вяртання з войска. У друкапісе з рукапіснымі праўкамі паэта ёсць і невядомыя вершы. Можна меркаваць, што яны былі напісаныя ў 1983-84 гг. падчас службы. Да невядомых вершаў адносіцца «А мне не трэба шлях, дзе скрозь падковы» — аптымістычны твор, у першым радку якога выказваецца жыццёвае крэда паэта. Радкі «Мяняў я коней, стомленых дарогай», «Быў я ў сяброў, як брыганціна ў чайках» даюць уяўленне пра характар героя верша, якога можна атаясамліваць з асобай паэта.

Верш «Маці» існуе ў двух варыянтах — надрукаваны на асобным аркушы і ў тэксце радыёсцэнара. Мне ўяўляецца, што Анатоль вымушаны быў перарабіць першапачатковы варыянт верша для радыёэфіру з прычыны ягоных рэлігійных матываў. Паэт параўноўвае сваю маці з «жывой Божай маці». У ягоных вачах такое падабенства з'яўляецца вышэйшай адзнакай. Рукою Анатоля Сыса ў сцэнары зробленыя праўкі, у якіх ён акцэнтуе ўвагу на тым, што вобразы Маці і Радзімы для яго з'яўляюцца непадзельнымі — такімі ж яны існуюць і ў ягонай паэзіі.

Анатоль ніяк не ўспрымаў «ідэалагічна правільную» паэзію. Ён грэбаваў і здзекваўся з рыфмаваных траскучых радкоў у гонар Леніна, партыі, рэвалюцыі ды розных іншых камуністычных святаў і падзей. Нават пішучы на «прахадныя» на той час тэмы, да прыкладу, пра Вялікую Айчынную вайну, ён асэнсоўваў яе праз канкрэтны цяжкі лёс свайго прыйшоўшага з той вайны бацькі. І ядзерную бамбардзіроўку Хірасімы, якую савецкія ідэолагі падавалі выключна ў антыамерыканскім ключы, ён успрымаў з агульначалавечых пацыфісцкіх пазіцыяў. У вершы «А мне білет да Хірасімы» ён абыграве факт, які найбольш уразіў яго: на самалёце, што скінуў атамную бомбу, лётчыкам было напісанае імя ягонай маці. І менавіта да яе звяртаецца паэт, спрабуючы асэнсаваць тую трагедыю.

У вершы «Верлібр першай сустрэчы з морам» можна адначыць знаёмы нам па іншых вершах паэта вобраз «адзінокага пілігрыма». Такім «адзінокім пілігрымам» і сам паэт пройдзе па гэтым зямным жыцці.

Ёсць у архіве некалькі вершаў, напісаных Анатолем Сысом у пазнейшыя часы — у 90-я гады, у пачатку 2000-х. Іх лёгка распазнаць па правапісе — «тарашкевіцы», на якую паэт перайшоў у другой палове 80-х гадоў, пасля пераезду ў Менск і далучэння да моладзевага нацыянальнага руху. Тады пераход на «тарашкевіцу» азначаў выразную грамадзянскую пазіцыю, арыентаваную на пераемнасць нацыянальных каштоўнасцяў і ідэалаў, якія бязлітасна знішчалі камуністы і за якія пераследавалі творцаў…

Выдрукаваны таксама «тарашкевіцай» захаваўся ў архіве і пераклад твора расійскага паэта М. Гнедзіча «Маім вершам». Як мне падаецца, думкі М. Гнедзіча, выказаныя ў гэтым вершы, былі блізкімі Анатолю Сысу, што і стала прычынай перакладу. Бескарыснасць у творчасці, любоў да музы, якая палала «з юных гадоў», душэўны настрой, што выліваўся ў вершаваныя радкі… Анатоль Сыс пагаджаецца з Гнедзічам, які гаворыць пра тое, што ён не гандляваў душою дзеля ўцехаў, што «часта трымаў іспыты на гонар і годнасць» і «з тых вопытаў выйшаў чыстым», што ён «ахвяр не паліў, патрапіць каб ідэалам свету». М. Гнедзіч, а праз пераклад і Анатоль Сыс жадае, каб людзі адшукалі ў ягоных вершах «сардэчную мову нябёсаў».

Спадзяюся, што неўзабаве невядомыя вершы Анатоля Сыса выйдуць асобным зборнікам, так як некалі і планаваў паэт. Несумненна, што гэтыя вершы сур'ёзна дапоўняць творчую спадчыну паэта, нашага прарока свабоды і незалежнасці.

Яблычны пах цішыні

Фелікс БАТОРЫН

* * *

Сінім азёрным атрамантам
Піша аповед верасень.
Статкам зялёных мамантаў
Пасвіцца лес на беразе.

Мы з ім адзінае цэлае —
Злепак няўрымснай старасці:
Цела спрэс змаманцелае,
Дух у зялёных парастках.

* * *

Ходзяць паралельна й папярэчна.
Ходзяць развітальна і сустрэчна,
А калі сустрэчна, то па-рознаму:
Лоб у лоб з паглядамі пагрознымі,
З сэрцамі, скрываўлена-паскрыленымі,
Ці інакш — з абдымкамі раскрыленымі.
Я іду, каб стрэцца, людзі, з вамі.
Як не сутыкнуцца нам ілбамі?

Неацэннае і бяскоштнае

Тое, што не мае цаны —
Альбо неацэннае, альбо бяскоштнае.
Рознае — па-рознаму.
І аднолькавае — па-рознаму:
У розны час альбо розным нам.
А розныя мы ўсе —
І ў часе, і паміж сабою.
Толькі адкуль столькі
Аднолькава безаблічных твараў?

* * *

Тысячы светаў адбітыя ў кроплях
залевы,
Што расцякаюцца тысячамі
раўчукоў,
Калейдаскопна змяняюцца
справа і злева
З безліччу імі імгнення
пражытых вякоў.

Людзі дажджу!
Павыходзьце з-пад стрэхаў чужыны
Вецер, адмыты ад дыму і пылу,
ўдыхнуць.
Чыста адмытыя,
лягуць пад ногі сцяжыны,
Што нас урэшце
на родным парозе звядуць.

* * *

Яблычны пах цішыні.
Мігі маўклівых ападаў.
Яблычныя прамяні
Сцежкі спярэсцілі саду.

Птушкі збіраюцца ў шлях,
Памяць пакуюць у клункі.
Яблычны смак на губах —
З верасnем пацалункі.

* * *

Месяц на вільчаку
Як зачапіўся чакою.
Не вырывайце чаку,
Не падрывайце спакою!

* * *

Жорсткія гульні дарослых дзяцей
З вераЙ у казкі і прагаю шчасця,
Вы запаўняеце лёсы людзей
Перш, чым у вечнасці людзям прапасці.

* * *

Адбіваюцца ў небе азёрныя зоры.
Адбіваюцца мятлікаў сонмы ад рук.
Адбываюцца казкі ў павольнай прасторы,
Дзе завіс у цянётах марудны павук.

Цемру певень скрыляе сваім «кукарэку»,
І змяшчаецца сэрца тваё, чалавек,
І ў хвіліну любошчаў, што вартая веку,
І ў няўлоўна-хвілінны зняможлівы век.

А дзе ж той плот?..

А дзе ж той плот збуцвелы,
Таемны пералаз
І ў садзе загусцелым
Здранцвелы дрэмны час?

Дзе тая камяніца
І сцежка ля яе,
Дзе мілай завушніца
Згубілася ў траве?

Адкуль над садам гусі
Вяртаюцца дамоў?
Дзе кола, куды бусел
Ляціць з галінай зноў?

А дзе ж той хлопец русы,
Што ў гэты лазіў сад?
Ці, можа, толькі гусі
Вяртаюцца назад?

* * *

Ля дрэва пазнання
Дабра і зла
Нашая доля вяночак пляла.
Адну толькі ночку
Хадзіла ў вяночку,
А потым будзённасць прыйшла.

Ля дрэва пазнання
Дабра і зла
Шторання сцяблінка ўзыходзіла з тла.
Адну толькі ночку
Хадзіла ў вяночку —
І доля шчаслівай была!

* * *

Сам у сябе — збунтаваны — пытаюся:
«Хто ты?
Носіш імя ці ўсяго толькі маеш назоў?» —
Дрэва жыцця штохвіліны мяняе лістоту,
Зносіць лістоту апалую вецер часоў.

Скрушнае ўсёю істотаю чую трымценне,
Болем знікнення цянюткі смыліць
чарашок.
Але гукнуць, як той Фаўст: «Супыніся,
імгненне!» —
Сілы не мае — ужо надарваны — лісток.

* * *

Волка і золка на ў золата ўбраным бульвары.
Вокны навокал птушыныя поўны журбы.
Век пражылі мы тут неперале́тнаю
парай,
Нібыта галкі альбо шызары-галубы.

Колькі на душах у нас паўзагоеных метак!
Хочуць задзьмухаць наш боль мілаcэрна
вятры.
Можа, таму нам садзяцца бязбоязна
гэтак
Проста пад ногі крылатыя нашы сябры?

* * *

Сышлі хаціны ўласныя,
Стаяць пры гмаху гмах,
І яблыні бязгасныя
Гібеюць у дварах.

Штогод драбнеюць яблыкі,
На штамбах мох сухі,
Бяздумныя нахабнікі
Абломваюць сукі.

Знядбаны ды замацаны
І дрэвы, і дамы.

Брак пачуцця грамадскага,
Бо не грамадства мы.

* * *

Што ёсць я на зямлі, мне дзень пры дні
Напаміналі крыўды і пакуты.
У неба я
спакою й цішыні
Прасіць пачаў — і ўрэшце быў пачуты.

Але калі спакой, нібы камяк,
На вочы лёг і сонейка растала,
А рот звязаў мне цішы даўкі смак,
Я ў жаху зразумеў: мяне не стала.

Выходзячы з кабінета кардыёлага

Калі малінавым грахом
Запахнуць ліпеня анёлы,
На мроі ўздыбленай вярхом
Памкну я, першатворна голы.

І пыркі зор з-пад капытоў,
Калейдаскоп святла і цені.
І вецер здзьме цяжар гадоў,
Як парушынак лёгкіх жменю.

І песень здолею злажыць
Без ліку я на радасць людзям.
Адно б да ліпеня дажыць, —
А там і смерці ўжо не будзе.

Жаўрук

З калосся ўзнялося ў надхмар'е, надлёссе
І ўпала ў азерца празрыстае скерца.
З вясёлкай на вейцы я кідаю лейцы
І ўслед серабрыстай распеўнай жалейцы
Праз зніклыя межы прасторы і часу
Лячу шасцікрыла на тройцы Пегасаў.
А птах, каго змесцiць дзіця на далоньцы,
Вядзе мяне ў вышнія высі да сонца.

Жывая вада

Пастарэў я, і мне на такую бяду
Прадала чарадзейка жывую ваду.
Можа, змыю маршчыны з ілба я?
Ах! На гэта надзея слабая.

Калі ж нават і так, ці ж паднімуцца з тла
Сваякі і сябры, што магіла ўзяла?
І як будзе нам з сённяшняй Ганнай?
Я так думаю, будзе пагана.

Ёй, Ганулі каханай, аддам я ваду
І яе сівізну і маршчыны зведу.
З кімсьці лепшым яна, маладая,
Хай шчаслівейшую долю спазнае.

Але Ганна адсунула конаўку прэч,
З лёгкім сумам сказала мне гэткую рэч:
«Хай з табой я не саладка ела,
Ды ў мяне ж дыябет застарэлы!»

Некранутай хаваю жывую ваду,
Бо ахвотніка ўсё на яе не знайду.

* * *

Л. Дранько- Майсюку

Крыніцу прыхаваў лясок
І дбайна прыкрывае веццем:
Не страшна, што на дне пясок —
Агідна на паверхні смецце...

* * *

Утульна існаваць бязмарна,
Калі і вочы сноў не сняць.
Быць можа, што не варта марна
І дэкарацыі мяняць.

Недаўменне

Цю-цю-цю, сабачка!
Я пачастую цябе сакавітай капусткаю.
Кызы-кызы, козачка!
Я дам табе свежай каўбаскі.
Пуль-пуль-пуль, курачкі!
Я насыплю вам солі з перчыкам.
О, Госпадзе!
Я ж быў шчодры і ласкавы.
Чаму ж нават сабака, каза і куры
Адвярнуліся ад мяне?!

* * *

Яблык сонца збівае вяршынямі лес,
Ды ніяк не злаўчыцца, каб збіць.
Вырываецца сэрца з кайданных жалез,
Ды ніяк іх не можа пазбыць.

Вольны свет шамаціць і плюскоча ў вакне,
Ды турэмшчык не выпусціць, не,
Бо жывее мой турэмчык глыбока ўва мне, —
Ён пухлінаю ўрос у мяне.

Азірніся, сынок

(Пралог і эпілог аповесці «Адарваць ад сэрца»)

Аляксей ФІЛАТАЎ

Ты не кліч мяне, мама, не кліч,
Нічога няма.
Я знаю, што была ты і была вайна...

Мікола Купрэеў

З той першай пасляваеннай, мірнай дарогі з Ляхавец у Маларыту, што не забудзецца да скону, кожнае падарожжа хвалюе. Не надта любіла сядзець на месцы мама. Ды выбрацца ёй у шлях заўсёды была вялікая турбота: доўга пакавалася, ладкавала гасцінцы, лічыла, пералічвала рублі і капейкі, пасля змяркання бегала па вёсцы, шукала да першых пеўняў вазніцу. Усёй сямейцы не спалася.

Але вось у падворку загрукацелі колы, фыркнуў аднавокі конік Васько. Мы прыселі на дарожку. Бабуля перахрысціла нашы спіны. Заварушыліся на клуні ў трох буслянках нашы буслы, нібы і яны развітваюцца з намі. Дзед Мікалай Крэнюўскі, якога дражняць Буслом, паправіў радзюжчыну на ладным пуку сена ў драбінах. Сена далікатненька бруіць падсохлым аерам. Умасціліся, едзем. Ад вобада таненькімі латачкамі адвальваецца спрасаваны коламі вільготны з ночы пясок. Світае. Трывожна, радасна, таямніча на душы. Маўчым. Цішыня. Нават птушкі яшчэ не прачнуліся. І тут мама шэптам: «Азірніся, сынок, паглянь — над зямлёю сонейка ўзыходзіць».

...Цяпер колькі ні езджу на радзіму (і шлях недалёкі), заўсёды шчыміць сэрца, жалобіцца душа, неўпрыкмет маркоціць яе думка: «Можа, больш не давядзецца ўбачыць гэту зялёную азіміну, невялікую чараду на першай пашы з двума пастухамі — падлеткамі і буслом, закапанага па кабіну ў нізінцы блакітнага «Беларуса», заліты паводкаю лес з астраўкамі жоўтай лотаці ў балацінах, са сцяжынамі сініх і белых канёздрыкаў на вышэйшым, хмызоў у маладой, далікатнай лістоце. Можа, не давядзецца ўжо сустрэць незнаёмых табе спадарожнікаў, што разыграюць нязменна перад вачыма камедыю ці трагедыю».

Пасля марозцу і ветру радуюся цеплыні на сядзенні аўтобуса. Адразу заўважаю дваіх цыганчукоў, хлопчыка і дзяўчынку. Не зусім абтрэпаныя, а ўсё ж — прадстаўнікі няўрымслівага, вандроўнага племя. На абоіх капронавыя зашмальцаваныя, зрэдзь падраныя курткі, баваўняныя калготы, паношаныя, з дарослай нагі жаночыя чобаты.

Хлопчык меншы, гадоў дзесяці, дзяўчынка крыху старэйшая, бялейшая і валасамі і скураю, можна падумаць: не цыганачка. Хлопчык жа — тыповае цыганя: бы масліны, навыкаце, крыху раскосыя глыбокія, поўныя пачуцця вочы, як смоль, кудзеркаватыя, густыя, рэдка ведаючыя расчоску і яшчэ радзей мыла і гарачую ваду валасы, з гарбінкаю нос, цёмная скура, доўгія далоні і доўгія, брудныя, у драпінах пальцы. Цыганяты дрэмлюць.

На чарговым прыпынку выходзіць нізкарослы, паморшчаны дзед з ядлоўцавым кіем у руках. Ніхто тут не сядае, але аўтобус далей не рухаецца. З-за шырмы нарэшце рэзка і піскліва гукае шафёр:

— А ў каго яшчэ білеты па пяцьдзясят капеек?

Цыганяты ўздрыгваюць, падымаюць галовы.

— А-а-а, вось яны, зайцы галапузыя, а-ну марш, а то шлангам па рэбрах!

— Ці табе шкода, няхай едуць, не ў такія страты дзяржава ўбіваецца і нават у вашай парафіі, — адазваўся адзін толькі я.

— А калі кантралёры, штраф хто будзе плаціць?

— Заплачу. Няхай едуць. Куды вам, дзеці?

Але яны мяне не слухаюць. Адно дзяўчынка абводзіць абыякавым, з журбінкаю, поглядам патухлых вачэй, як пабітае сабачаня, пакорліва спускаецца з прыступак. Хлопчык агрызаецца:

— Мы да перахростка білеты бралі. Чаго гоніш? Не сыду, — у вачах закіпае непакора. Дзяўчынка цягне брата за рукаў.

— Хадзем назад, дзеці, зараз возьмем білеты.

— Не трэба нам тваёй ласкі! — сярдзіта кідае хлопчык. І ў нас абодвух дрыжаць, крывяцца губы, ледзь не коцяцца слёзы з вачэй.

— Што, без грошай захацеў праехацца, паганец? — вызверыўся стары на хлопчыка, як толькі той ступіў на зямлю.

— Цябе не чапаюць, дзеду, шкандыбай сваёй дарогаю.

— Ах ты, ваўчаня! — дзед нават замахнуўся кіем.

Аўтобус гойднуўся, пакаціў далей, на пляцоўцы засталіся трое. «Як там у іх, што там з імі? Эх, дзеду, дзеду, адкуль, з якім узварам усмактаў ты ў душу пагарду і злосць да гэтых, усё яшчэ забітых, забытых, мо нават і Богам, своеасаблівых людзей? А хто вас, маленькія вольныя птахі, выправіў у шлях? Ці давядзецца вам сёння паесці, сустрэць добрую душу, сагрэцца жывым цяплом чалавечым, пачуць ласкавае слова ад вашай цыганскай мамы?»

Хмараю густога, чорнага пылу сустракае мяне мая вёска. Хоць яшчэ толькі пачатак вясны і вільгаці шмат наўкола, пыл настолькі густы, што цяжка разгледзець разараныя былыя лугі, выганы, сенажаці і пашы. Іх уздоўж і ўпоперкі прарэзалі пустыя калектары з рыжцам на дне сярод рудога, неглыбокага тарфяніку, — меліярацыя...

Нарэшце і прыпынак. Не паспелі адчыніцца дзверы, тут як тут кантралёры.

— Каго вязеш без білета? — на поўным сур'ёзе, нават без ценю гумару.

— Калі шафёр, дык і злодзей па-вашаму?

— Пабачым, пабачым.

— Глядзі, глядзі, каб табе павылазіло! — буркнулі мужчыны.

— Ці вам не сорамна! Заправы — плуга пацягне, — усхадзіліся кабеты.

Кантралёры не звяртаюць на кпіны ўвагі, двое дужыя, не старога веку шнырацьсяюць сяроду пасажыраў. Ажно і валакуць кульгавага дзядзьку, які тыча ім пад нос нейкае ў шэрых вокладках пасведчанне.

— Яно не дае табе права ў етым аўтобусе, — гугніць дужэйшы, касавокі кантралёр.

— А ці не адзін хрэн, у якім аўтобусе бітую гадзіну на парэнчы вісець?

— Ён увесь век тутака ездзіць. Ці не бачыш? Пратры лыпаўкі — інвалід, — заступаюцца ўпарта, адзінагалосна.

— Выходзь, выкіну! Прагрэсіўку, калі зрэжуць, ты мне не вернеш, чорт штылявы! — высоўваецца ў салон шафёр.

— Не чапай, — цяжка разагнула стогадовую спіну дрымучая, але ўсё яшчэ дужая, у старасвецкай апынанцы і ўжо босая бабуля, у якой нарэшце пазнаю сваю былую суседку, бабу Католіху. — Сын він мэні. З лісу калікою вэрнувся. Усі мы, дзітятко, у лісы булы, всі кору з жэлуддзем ілы. Лipш я сама злізу. — Працягнула кантралёру свой пакамячаны квіток...

Аўтобус заспяшаўся далей, у канец даўжэзнай нашае вёскі. Я стаю пасярод вуліцы і пакутліва разважаю: «Чаму за цыганчукоў не заступіліся, другое племя, чужая кроў?..».

Вось і мэта майго падарожжа — могілкі. Найперш іду да Іх. Ля брамы здымаю шапку, мінаю вышэзны, ладна падгнілы дубовы крыж з прыбітымі на парэнчах сімвалічнымі драўлянымі абцугамі і малатком (пры іх дапамозе ўкрыжавалі Хрыста, мо і на самай справе таму, што «ён быў паэтам»?). Пацяжэлыя ногі кіруюць пад магутную, у пяць ствалоў з аднаго караня бярозу. Доўга стаю ля сціплага помнічка за металёвай агароджаю. Не магу адвесці позірку ад дарагога, ледзь кранутага змаршчынкамі матчынага твару, што смутна-ласкава глядзіць на мяне з фотакарткі...

«Мама, мама, у першую хвілінку, калі двухгадовым хлопчыкам у нямецкім шпіталі я ўбачыў цябе, у маім маленькім сэрцы нарадзіліся словы: «Жэнік, наша мама прыйшла!». Але Жэнік не кінуўся табе на шыю. Брат, крышку старэйшы, заплакаў у кутку. На табе было такое ж паліто, якое насіла мая родная мама, якую забіла фашысцкім снарадам у першы дзень вайны. І яна так доўга ўжо не прыходзіла да нас. Можа, я пазнаў менавіта гэтае паліто і адразу назваў цябе дарагім для нас абоіх словам. А можа, гэта здарылася таму, што ты была такою маладою, такою прыгожаю, а ў тваіх, затуманеных слязою вачах разлівалася спагада, пяшчота, матчына любоў, якіх хапіла мне на трыццаць гадоў, што мы былі побач, і якіх так не хапае цяпер. Ты далікатнай рукою, ад якой ішоў тонкі, чароўны водар марознай свежасці і цвітучага бэзу, гладзіла параненую асколкамі маю галаву, нават пацалавала яе. Хіба мог я ад цябе адарвацца? Хіба ты змагла б пакінуць мяне? Ты прыйшла выбіраць з чатырох нас, сцалелых, а я выбраўся сам»...

Паспавядаўшыся, крыху лягчэйшым крокам падаюся глыбей — да патрэсканай бетоннай пліты на брацкай магіле, у якой, па словах дзеда Бусла, ляжыць мая родная, у два разы маладзейшая за мяне.

І тут пяшчотна, ціха, да драбніц знаёмае: «Азірніся, сынок...».

Так сціснула, не дыхнуць. Патыхні гаючым водарам чабору, не гані ў тлум ад матчыных магіл, палані старажытнаю песняю, уваскрасі вечнаю малітвою, абнаві мае думы, утаймуй маю смагу, Родная Зямля!

Пісьмёны лёсу

Рыгор СІТНІЦА

Ізноўку лістота злятае
з маркотных галін
І штосьці вярэдзіць салодка, балюча,
шчымліва,
Як песня, што ведаў, але не згадаю
матыва,
Як смутны і кволы, але дарагі напамін.

І зробіцца сумна. Ды ўсё ж гэта будзе
не сум,
А іншае нешта надыдзе, наступіць,
настане...
Ці ў чым вінаваты, і прагне душа
даравання?
І грэх той забыты яе працінае дазвання,
Ці мо шкадаванне я нейкае ў сэрцы нясу,
Ды не разумею па кім, ці па чым
шкадаванне?..

Я нешта згубіў. Але што, але дзе і калі?
І мёртвае лісце ляціць па ўчарнелай зямлі.

1999 г.

Казка

Я зусім выпадкова падгледзеў
і толькі табе скажу, —
Мой знаёмы ліхтар закахаўся
ў дачку пазаўчарашняга даджу,
У маленькую лужынку,
поўную неба і сонечнага святла...
О, якім яна дзівам
у смутак яго ных вачэй увайшла!
І святочнымі сталіся раптам
заўсёдна-будзённыя дні.
Ён паверыў, што межаў не маюць
прадонні яе глыбіні;
І забыўся на ўсё:
не бачыў ні дрэў, ні машын, ні людзей...
Толькі лужынцы любай
закахана ў вочы глядзеў.
А яна таксама
ад яго не магла адвесці вачэй;
І святло ліхтарнае
станавілася кожнае ночы ярчэй.
І паміж астатніх
ліхтароў і лужын тутэйшай зямлі
Шчаслівейшымі самымі
гэтыя двое напэўна былі.
Вось такая цудоўная
пасялілася казка ў нашым двары,
І зайздросцілі ёй
усе лужыны і ўсе ліхтары;
А каханак наіўны
нават і думаць не думаў, чаму
Усё меншай і меншай
чароўная лужынка бачылася яму.
Ды хвілінаю нейкаю
сталася ўсё несапраўдным вакол, —
Заміж адлюстравання свайго
ён пабачыў брудны асфальтавы дол;
І лянівы вецер варушыў, нібы смецце,
парэшткі нейкіх падзей;
І аднекуль узнікла
процьма пачварных дрэвамашыналюдзей;
І такім недарэчным
яму падаўся жыцця забытага шал...
І прабачце, што сумным
будзе ў гэтае дзеі фінал.
Бо да шэрай зямлі прыкаваны
журботным паглядам, усё ж
Той ліхтар у нябёсаў вымольвае нема
пасдаць яму дождж...
Ды адкуль яму ведаць
выснову сумна-разумных людзей:
Што ніколі нам двойчы
не быць у адной і той жа вадзе.

1999 г.

***

Пра што гаворыць птушыны клінапіс
На снезе белым, нібы пергамент?
Пра што яліны крэсляць галінамі,
Даверыўшы воблаку свой тэстамент?
І гэтых аблокаў маўклівы рух,
І рэха зліваў і завірух,
І цемры велічнае Нішто —
Пра што?
Пра што вы, поле, сцяжына, камень?
Пра што? — імгненна.
Пра што? — вякамі:
Адбітак,
водгулле,
рэха,
след...
Калісь аднойчы я стану Вамі,
Тады спасцігну Ваш альфабэт.

2000 г.

***

Прасілася сцюжа пусціць яе на пастой;
Ды холаду ўсім ставала, бо не пустой
Пячора была ў той вечар, і хоць у той
Мясціне снежань завецца зусім іначай
З прычыны адсутнасці снегу, але мяло
Пяском і мякінай, і холадна ўсім было,
Апроч натомленай Маці, бо ў той
дзіцячай
Усмешцы першай столькі было цяпла,
Што раптам вільготным зрабіўся
пагляд вала,
І вочы авечак святлом слязіліся ціхім,
І шчасце капала з веек у парадзіхі...

А з высяў, яшчэ недасяжнае і слабое,
Ёй чулася: «Радуйся, Дзева,
Гасподзь з Табою...»

2000 г.

***

Звечарэламу пляжу за дзень
надакучыла пераспіпаць
Сваю зыбкую сутнасць пад цяжарам
тысячаў целаў.
О, як добра цяпер яму быць
даўдна апусцелым;
І змарнелае сонца збіраецца
класціся спаць,
Галаву, як дзіця, накрываючы
коўдраю мора,
А схуднеламу дню самы час
падавацца ва ўчора.
Я да ростаняў дальніх паглядам
праводжу яго,
І аблашчыць душу маю
цуду далёкага подых,
І між хваляў барвяных
пазнаю аблічча Таго,
Хто на свеце аддзіны
ступаць ўмее па водах.

2002 г.

***

Ля дзвярэй філармоніі
ці на прыступках музычнай вучэльні
Выпадковыя гукі
прыжыцца спрабуюць у нотнай сябрыне,
Бо любому з іх хочацца
быць хоць бы трохі скрыпічным
ці віяланчэльным,
Радавод ведучы свой
ад Моцарта
ці Паганіні.

2002 г.

Пад музыку Вівальдзі

Жоўтае лісце на змоклым асфальце
Пераступаем, шукаючы выйсця...
Гэта было, прыгадай, у Вівальдзі:
Сцежкі вільготныя, жоўтае лісце...
Гэта пасля паўтаралася з намі,
Гэта вярталася крозамі, снамі...
Гэта ў душы маёй перапляліся
Сцежкі вільготныя, жоўтае лісце.
Гэта дары твае, праведны Ойча!
У мітусні, у аблуддзі, бязладдзі
Нас уратуюць яшчэ не аднойчы
Жоўтае лісце і гукі Вівальдзі.

2007 г.

***

Г. М. Бураўкіну

П'едэстал, трыбуна ці турма,
Кайданам бліщчэць ці эпалетам,
У паэта выбару няма,
Акрамя, як толькі быць паэтам.
Хай завецца золатам г...но,
Хай дарога спыніцца астрогам, —
У паэта вышэй ёсць адно —
Прамаўляць намоўчанае Богам.

2011 г.

***

А таму, што так лёгка прыйшла,
і так проста, быццам няўзнак,
Праз гадоў прадонне пераступіла
амаль у біблейскі міф,
І таму, што назваць гэта ўсё
я дасюль не ведаю, як, —
Я назваў цябе Суламіф.
І няхай не было алівай
і ксты вінаградных лоз
Не маглі твае цела лашчыць
і так, як ты, любіць,
Ды здалося, — твае прышэсце
адвязны выдумаў лёс...
Ну што мне было рабіць?..
І таму, што зусім не цар я
ні духам, а ні па радні,
І прыгожым міфам
даўно ўжо аблудны не верыць свет,
Каб хоць нейк нашае ўсё
захінуць ад будзённай хлусні,
Я назваўся — Паэт.
І раскоша тваіх таямніцаў
мне мёду была саладзей,
І твае віно смактаў я,
нібы згаладалы звер,
І квітнеў пацалункавым шалам
на клумбах юных грудзей
Мой самы свавольны верш.
Ты купала мяне ў лагодзе
амаль на мяжы забыцця,
Я цябе, апранаючы ў вершы,
як мог, захінаў ад страт...
Ды, у люстэрка глянуўшы, згадваў,
што ты мне — амаль дзіця,
І што час — мой вораг і кат.
Ты ўжо хутка мяне пакінеш,
бо лёс падае мне знак,
Але знікнуць табе не дам я
ні ў сон, ні ў замшэлы міф,
Бо цябе пасяліў я ў вершы,
бо ведай, — не проста так
Я назваў цябе Суламіф.

2013 г.

Шпацыр па Грушаўцы

I

Як ветрам узнятыя ветразі,
Таполі трапечуць і клёны;
І ходзіць у ветраным верадзе
Не дужа цвярозы верасень
Па Грушаўцы залачонай,
(Што ў места — дачкою хрышчонай,
Ды з Бахусам заручонай).
Па бруку, засланаму лісцем,
Па Грушаўцы, той, што калісьці,
Напэўна яшчэ да саветаў —
Ды хто ўжо згадае пра гэта? —
Пайшла ў гарадскія заробкі
Да места суседняга Менску,
(Стаміўшыся быць «дзеравенскай»,
З вяскоўцаў пайшла назаўсёды);
Пайшла, ды, відаць, заблудзіла,
Ці можа ў дарозе прыстала,
Не здужаўшы шлях той адолець,
Бо вёскаю быць перастала,
Але ж і дасёння — не горад.
І ў гэтым ёсць сціплае шчасце
Для ўсіх саматужных паэтаў,
Што мройнаю вулкаю гэтай,
Без пэўных блукаючы мэтаў,
Свае летуценні згадаюць;
А ў тым, як лісты ападаюць,
Канечне ж, угледзяць прыкмету
Кахання былога і лета...
А што найважней для паэта,
Чым гэтая ціхая радасць:
Парушыўшы звыклы парадак,
Удвох са сваёй адзінотай
Пайсці, заблудзіўшыся ўпотай,
На некалькі шчасных гадзінаў?..
І хай сабе смешным і дзіўным
Здаецца камусьці такое,
Ды можна на тое рукою
Махнуць і ў самое зацішнай
На вуліцы гэтай не лішнім
Пабыць, не апошнім, не першым,
Чытаючы кволыя вершы
Платам, ліхтарам і сабакам
Пад вокнамі змрочных баракаў...
Святкуй, вераснёўскі паэце!
Бо, пэўна ж, не знойдзеш у свеце
Чагосьці істотнага болей,
Чым шэрае голле таполяў,
Ды іхнія доўгія цені
У шолаху і шамаценні
На вулцы, заваленай лісцем,
На Грушаўцы, той, што калісьці...

1998 г.

II

На парушанай Грушаўцы,
дзе блукала калісьці амаль бязмэтава
Мая мроя паэтава;
Дзе абвал лістападавы,
дзе ў яго ным п'янкім шапатлівым меласе
Патанаў я ў пошуках
праміналага часу слядоў і знакаў;
Дзе пісьмёны лёсу
распазнаць наіўна хацелася
У панурых вокнах баракаў.

Там я зноў свой смутак
вяду, нібы сталкер, ды лепш — паломнік
У нішто, дзе месца
адно толькі згадкам, мярэжам, ценям;
Дзе блукаю, быццам
самому сабе пажыццёвы помнік,
Як даніна журботная
колішнім вершам, снам, летуценням.

Там цяпер экскаватар
пануе суладна з чугуннай гіраю,
І не толькі сцены старыя
руйнуюцца, трушчацца, крышацца...
Да спаткання, Грушаўка,
у незваротным нябесным выраі.
Тут вершы болей не пішуцца.

2013 г.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 10 (98) | 24 кастрычніка 2014 | № 40 (409) Новы Час

Эпоха звера

Старонкі рамана

Сяргей ВЕРАЦІЛА

— Дзеда, няўжо ўсё гэтае адбудзецца?

— Што «ўсё?»

— Ну тое, што павінна адбыцца, няўжо будзе?

— А што табе яшчэ хочацца ведаць?

— Я хачу ведаць, навошта паўтараецца казка? кім быў прыдуманы дождж? чаму ад прыгожага жыцця агню застаецца шэры попел? чаму я не магу абняць вецер? і каго можна не лічыць вар'ятам, калі гэты свет пакінула музыка?

— Гэта ўсё?

— Не. Яшчэ я хачу ведаць, калі заканчваюцца пытанні і колькі на іх існуе адказаў?...

Машына распарола фарамі начную цемень двара і спынілася, не даехаўшы да пад'езда. Кот ля дзвярэй адразу затурбаваўся. З машыны абавязкова выйдуць людзі, і ён зможа за імі ўпіхнуць сваё гнуткае цела ў цёплае сутонне пад'езда...

Кот напружыўся, але ягоная ўпэўненнасць не спраўдзілася. Людзі не рушылі да пад'езда, а спыніліся перад машынаю. Адзін абапёрся на капот, другі дастаў з кішэні штосьці пляскатае і прапанаваў:

— Закурым?

— Ого! «Герцагавіна — Флор»! У вас, товарищ лейтенант, как у Самого...

У ягоным голасе адчувалася шчырае захапленне. Наогул, эмоцыя неяк не звязвалася з чорна-бліскучаю аднастайнасцю вопраткі. Той, ля капота, узяў папяросу, і скрыначка зноў перакачавала ў гаспадарскую кішэнь. Яны закурылі. Кожны паасобку. Адвярнуўшыся ад ветру. Старанна хаваючы між далоняў агеньчык. Зрабілі па зацяжцы і, выпускаючы дым, адначасова зірнулі ўверх. Ва ўсім доме свяцілася толькі адно акно, і гэтае акно было мэтаю іхняга прыезду. Акно не толькі свяцілася, з яго яшчэ даносілася музыка. Ціхая. Час быў позні.

— Шапэн, — неяк абыякава сказаў гаспадар папяросаў, якога назвалі лейтэнантам.

— Вы всё знаете, товарищ капитан! — зноў захапіўся другі, той, што стаяў ля капота.

— Всё не всё, но работа у нас такая, чтобы всё знать.

— И что, я тоже буду знать так много, как и Вы?

— Будешь, но не столько.

— Почему? Я хочу знать много.

— Во многие мудрости — многие печали.

— Что Вы сказали, товарищ майор?

— Я говорю: у нас знают столько, сколько положено.

Лейтэнант адказаў ціха, спакойна, нават абыякава. І гэтая абыякавасць паказвала на тое, як мала вартасці ён надае сваёй інтэлектуальнай перавазе.

— А кто это сказал?

— Соломон. Один еврей.

— Бундовец? Ревизионист ?

— Да нет. Он давно жил, более двух тысяч лет назад.

— Наверное, умный был, раз Вы о нем помните. Нам бы его сюда, нам умные люди ой как нужны. Мы ведь сейчас строим новую жизнь, и у нас ему бы работа нашлась.

— А может, он у нас и работает?

— Ну и шуточки у Вас, товарищ старший лейтенант! А мне все равно хотелось бы знать много. Вот я специальность получил и уже работаю шофером, а не в забое, а если бы мне образование... — Голас шафёра ў канцы фразы стаў мяккім, — у нас в деревне одна бабка была: и шептала, и могла от суроку спасти, и знала, какая погода будет, и краденое находила. К ней все шли. Лучше попа́ жила.

— И где она теперь?

— Выслали.

— Многознание уму не научает, — усміхнуўся лейтэнант, ведаючы, што іронія шафёра не дастане.

— А кто это сказал?

— Гераклит Темный.

— Ну, раз темный, то и записывать не следует. Хотя и хорошо сказано.

— А ну, постой! Ты что, записываешь?

Толькі цяпер лейтэнант убачыў у шафёравых руках невялікі, але ёмісты нататнік у чорнай і бліскучай вокладцы.

— А я всегда за Вами записываю.

— Да я тебя, бл..ь этакую, в пыль лагерную разотру! Вошь барачная!

— А Вы не волнуйтесь, товарищ лейтенант, рапорт то все равно мне писать.

Лейтэнант сцішыўся. Уменне валодаць сваімі нервамі лейтэнант лічыў сваёй найвышэйшай вартасцю.

— Ладно, извини. Погорячился.

Скрыначка з папяросамі зноў выплыла з кішэні. Мужчыны закурылі.

— А этот, ну этот... икак его? — замяўся, нешта ўзгадваючы, шафёр.

— Кто этот? — насцярожыўся лейтэнант.

— Ну, этот, который музыку написал. Кто он?

— А, Шопэн, — чамусьці з палёгкаю выдыхнуў лейтэнант. Вопытнае вока, дарэчы, адразу б заўважыла, як у лейтэнанта дрыжаць рукі — па трымценні агеньчыку папяросы, — Поляк. Музыкант. Нравится?

— Мгм... — адказ быў шматзначны. «Белабандыт. Сука. Пілсудчык», — падумаў шафёр, але ўголас рэзюмаваць не стаў. Дакурвалі моўчкі. Кот увесь звёўся ў чаканні, калі адтуліцца цёплая зеўра пад'езда. Нарэшце, здаецца, дачакаўся. Дакурылі. Акуратна прыдушылі ботамі агеньчыкі. Лейтэнант паправіў паліто і рушыў. За ім адарваўся ад капота і шафёр.

— Дзеда, дзеда! А я сон бачыў.

— Сны не бачаць, а сняць.

— Деда, дык я сніў...

— Пра філасафа, які сніў, што ён мятлушка, якая сніла, што...

— Ды не. Гэта я раней сніў. І адкуль ты ведаеш? Я ж табе пра яго ніколі не расказваў.

— Хы — хы...

— Ты заўсёды з мяне падсмейваешся. А калі я стану старым, я таксама буду ведаць усё, як і ты?

— Ты не станеш старым.

— Як гэта... не стану? Ты ж стаў.

— Я быў.

— Так. Ты быў маленькім, а потым вырас і стаў дзедам. І я выраcту і стану дзедам, і буду хадзіць з маленькім хлопчыкам уздоўж берага, адказваць на пытанні і ўсміхацца.

— Толькі берага гэтага не будзе...

— Як гэта не будзе? Гэты бераг будзе заўсёды. Нас не стане, а бераг будзе. Мы ідзем, а бераг застаецца, і мы вяртаемся да яго, і мора шануе пясок і сцірае сляды выпадковых словаў. А за даляглядам — новы бераг, да яго імкнецца душа, а сэрца — да гэтага берага. І любая ракавінка лёгка пацвердзіць сваім шамаценнем нязменлівасць гэтага мора, гэтых хваляў, гэтага берага. Нас не стане... А нас не стане?

— Не стане, не стане, не стане, так проста, прасцей не бывае,

— Мора падрабляе словы. Толькі я разабраць іх не магу...

Недзе далёка загучэла машына. Гук было добра чуваць, бо тут заўсёды было ціха. Ён скалымнуўся: «Усё, пара». Ён ні хвіліны не сумняваўся, што едуць па яго. Яшчэ раз агледзеў пакой. Яшчэ пазаўчора, не, нават да ўчарашняе раніцы ён жыў спакойна, але гэты тэлефонны званок... Ён па звычцы лянiва падышоў да апарата, па звычцы ляніва падняў слухаўку, і яму давялося прыкласці максімум намаганняў, каб саслужбоўцы не заўважылі ягонай шалёнай разгубленнасці.

— За Вамі прыедуць. Заўтра.

Голас быў уладны, упэўнены і адначасова безынтанацыйны, і ён чамусьці паверыў у тое, што так і будзе.

Два дні ён рыхтаваўся да ўцёкаў, хаця ўцякаць не было куды, бо за жыццё ён ніколі не падумаў пра надзейныя схованкі. Сяброў, якія маглі б рызыкнуць даць прытулак, ён не меў. У асноўным — жанчыны, але хавацца ў іх ён лічыў ніжэйшым ад сваёй годнасці. Гук машыны ўсё набліжаўся і набліжаўся. Але ісці не хацелася. Прыходы — сыходы...

— Ну што ж, мы прыходзім дзеля таго, каб пайсці. І калі мы не спяшаемся гэта зрабіць, дык прыходзяць па нас, — яшчэ пазаўчора такая філасафема падняла б яму настрой, яшчэ пазаўчора, нават да ўчарашняга ранку, але зусім не сёння.

— Ладно. Я пойду.

— Товарищ лейтенант, я с Вами.

— Оставайся здесь, — лейтэнантаў голас раптам стаў жорсткім і халодным, і шафёру ў галаву не прыйшло аспрэчваць рашэнне, хаця па статуце ён павінен быў суправаджаць камандзіра. Ён і не стаў аспрэчваць, а звярнуўся з просьбаю:

— Товарищ лейтенант, можно...

— Я же сказал, нет.

— Товарищ лейтенант, я только папироску хотел.

— А, закурить. Возьми все.

— Да нет. Благодарю. Мне и одной хватит.

Лейтэнант паклаў пачак у кішэнь і ўжо хацеў ісці, але нешта незвычайнае ў позірку шафёра прымусіла яго затрымацца.

— Ну, что тебе еще?

— А ўсе-такі дзіўна...

— Што «дзіўна»?

— Кажуць, што ён — сын Самога.

— Я стараюся аб гэтым не думаць.

— Не думаць! — засмяяўся люты вецер.

— Ты нешта сказаў?

— Не. Гэта вецер. Ён у такія ночы як быццам гаворыць.

У яго, як ён і спадзяваўся, меўся ў запасе час прынамсі дзеля таго, каб здзейсніць адразу два ўлюбёныя заняткі: выкурыць папяросу і выпіць кубак гарачага чаю без цукру. Плюс да таго можна паслухаць пару начніц няшчаснага паляка. У яго яшчэ ёсць час, бо яны звычайна прыязджаюць пасля апоўначы, калі чалавек зусім цёплы і як бы не чакае. Так, звычайна апоўначы. Увечары чалавек чакае, увесь напружаны. Час ідзе, па яго не едуць, і спакваля нараджаецца спадзеў, што, можа быць, не сёння. Ну вось і дзень канчаткова мінуў, і не прыехалі. І навошта ім гэта рабіць уначы, калі гэта можна зрабіць удзень, а яшчэ лепей — увечары. Яны таксама людзі і таксама любяць спаць па начах. Ну, здаецца, не прыедуць. Можна класціся спаць. Яшчэ колькі будзе трывожна, не ў такт гадзінніку, тахкаць сэрца, а потым сон канчаткова адрэжа ад жорсткае рэчаіснасці. А тут раз — і агаломшаць: «Што, сукі, не чакалі?» Мусіць, ёсць нейкая асаблівая асалода ў назіранні паўсоннае разгубленасці, мокрых ад слёзаў вачэй, мітусні, суправаджаемай прыглушанымі галасамі. Ад словаў такіх, паўтараемых і таму такіх звыклых ніякіх: «Товарищи... Это ошибка... Я буду писать Самому...» Хаця, мусіць, дарэмна шукаць нейкую логіку ў іхніх прыездах. Яны едуць і ўначы, і ўранку, і ўдзень, і ўвечары. Вакол ворагі...

Да апоўначы ў яго яшчэ ёсць колькі часу, а потым ён будзе далёка.

Ногі быццам свінцом наліліся, і ад самых пятаў да макаўкі прайшла хваля непрыемнае гарачыні, і ажно пад сэрцам закалола. Лейтэнант ніколі б раней не падумаў, што нейкі звычайны візіт, самая што ні на ёсць «будзённая аперацыя» можа прымусіць яго так хвалявацца. І ён тады зрабіў тое, што рабіў ужо некалькі разоў, калі падводзілі нервы. Гэта было ягонаю прыдумкаю і ягонаю таямніцаю. Гэты таямнічы сродак заключаўся ў тым, што ў хвіліну страху й небяспекі лейтэнант выклікаў у памяці постаць Важара. Той уважліва, па-бацькоўску глядзеў на яго, прыгладжваў невялічкаю далонню рудыя з сівізною валасы, а другую руку з заціснутаю піпкай закладваў за спіну і, па-добраму ўсміхнуўшыся, нахіляўся да лейтэнанта. І за гэты позірк, за гэтую ўсмешку, за ўвагу Тытана да ягонае мікраскапічнае асобы лейтэнант быў гатовы да любога подзвігу, да любое ахвяры...

Да маквісу заставалася ўсяго на адзін кідок цела. Усяго адзін — і ён вольны. Але якраз у гэты момант ягонае цела спаралізаваў страх. Вершнікі ўжо былі блізка, настолькі блізка, што ён бы лёгка мог разгледзець любую дробязь, калі б захацеў гэта зрабіць. Ён ляжаў на зямлі ў позе, прызначанай для скачка, што так і не адбыўся. Вушы яго, прыціснутыя да вялікай прыгожай галавы, сведчылі жах. Тое самае маглі пацвердзіць скругленыя і расшыраныя да немагчымага зялёныя вочы. Поўная вырачанасць і пакорлівая нерухомасць звера сведчылі на перамогу чалавека. Сутыкненне двух сусветаў: дзікага і цывілізаванага, выявіла перамогу апошняга, і гэтая перамога была неаспрэчнаю. У той момант, калі ягуар залёг, вершнікі рассыпаліся і ўтварылі паўкола, канцы якога ўпіраліся ў маквіс. Паўкола сціснулася, і ад бліжэйшага вершніка, а значыць і ад смерці, ягуара аддзялялі якіх небудзь пяцьдзясят крокаў. Прага жыцця, што заўсёды так радасна спружыніла цягліцы, пакінула звера, і ён абыякава і зацкавана рыхтаваўся да лёсу паляўнічага трафея. Раптам той вершнік, што быў найбліжэй, падняў руку, і гэты жэст спыніў пагоню. Разам з людзьмі і коньмі спынілі свой бег і сабакі, толькі

брахаць не перасталі. Людзі раззлавана крычалі на коней і на сабак. А той вершнік, што спыніў пагоню, зірнуў у зялёныя ягуаравыя вочы сваімі зялёнымі вачыма і, не адводзячы позірк, стаў пад'яджаць да звера ўсё бліжэй і бліжэй.

— I Cuidado! Don Jose, Cuidado! — закрычалі вершнікі.

Але той, не адводзячы позірка ад ягуаравых вачэй і не звяртаючы ўвагі на папярэджанні, пад'язджаў усё бліжэй. Конь, адчуваючы драпежніка, дрыжэў усім целам і фырчэў, але нат не рабіў спробаў вырвацца. Калі да звера засталося самае большае крокаў з пятнаццаць, вершнік спыніўся, і ягоная правая рука дастала карабін з убранага срэбрам футарала, прымацаванага да сядла, таксама ўбранага срэбрам. Чалавек узняў карабін, і мушка спачатку адзначыла ніжнюю частку пысы з грознымі ікламі, потым бы ўперлася ў нос, потым на нейкае імгненне затрымалася паміж круглых, поўных жаху вачэй. У гэты момант позіркі сустрэліся, і чалавек убачыў у вачах звера адчай, безнадзейнасць і разам з тым поўнае раўнадушша да лёсу. Позірк як быццам казаў: «Жыццё — барацьба, і ў ёй ёсць заўсёды пераможцы і пераможаныя. Ты — перамог і можаш узяць маю кроў». Чалавек перамог, і кроў рабілася непатрэбнаю.

— I Don Jose, pusil, pusil! — закрычалі вершнікі.

Але чалавек запавольваў тое імгненне, калі палец быў павінен націснуць курок. Чалавек ужо не хацеў крыві. I гэтым запавольваннем зеленавокі чалавек даваў шанец зеленавокаму зверу. Ягуар скарыстаў гэты шанец. Адзін кідок цела, і кусты расхінуліся яму насустрач. Тут жа іхняе гнуткае калючае галлё захінулася, адразаючы шлях пагоні. Наўздагон прагучалі стрэлы, і адна з куляў нават джыганула недзе ў правым баку па рэбрах. Вершнікі спусцілі сабак, маквіс быў для іх запаведнаю зонай, бо ўсе яны былі трэніраваныя для адкрытых прастораў, можа, толькі акрамя велічэзнага ваўчара, які лёгка душыў каётаў сваімі магутнымі сківіцамі, і, зразумела, саслаблены ягуар быў ягонаю законнаю здабычай. Ваўчар імчаў след у след за ягуарам; яшчэ адзін скачок, і магутныя сківіцы злучацца на варожай шыі, і белыя шматкі сліны змяшаюцца з крывёю. Яшчэ адзін скачок...

Ягуар рэзка развярнуўся і моцна ўдарыў лапаю па неабароненым жываце. Пяць выдатна навостраных кіпцюроў адначасова выслізнулі з-пад мазалёвых падушачак і паласнулі мяккі сабачы жывот. Удар быў і моцны, і трапны. Шызыя кішкі адразу ж вываліліся вонкі, але гэта не спыніла ваўчара. Ён прагнуў варожага горла. Яшчэ крыху... Кішкі, зачапіўшыся за куст, замарудзілі смертаноснае рушэнне. Ягуар жа скаціўся ўбок, ускочыў на чатыры лапы, выгнуў спіну, зашыпеў, спружыніў уверх і сакрушальным ударам лапы пераламаў сабачы хрыбет...

Машына была ўжо зусім блізка. Ён добра пачуў, як яна спынілася каля дома. Часу ўжо не заставалася. Усё. Сысці. Прыходы-сыходы. Ён паставіў на прайгравальнік сорак пятую «Развітальную» і яшчэ раз абвёў вачыма пакой. Эх, каб можна было тут застацца, ён быў бы шчаслівым чалавекам. Як мала часам чалавеку патрэбна, каб адчуць дотык сапраўднага, без выдумак шчасця! Часу ўжо не заставалася, і праз дзверы ўжо не выйдзеш, машына ля пад'езда. Яшчэ заставалася вакно на кухні. Дзякуй Богу, у яго толькі другі паверх. Ён падхапіў упакаваны заплечнік і рушыў на кухню. Шыбу адчыняў асцярожна, чамусьці баяўся пабіць шкло. Сабачку заела, і ён добрую хвіліну правалтузіўся з ёй. Ад напругі ажно рукі пачалі дрыжэць. Нарэшце адчыніў і адразу кінуў уніз заплечнік. Заплечнік зачапіўся за лапу вішні, што расла пад вакном, павісеў на ёй крыху і ўпаў на зямлю. Ён цяжка залез на падваконне, і ў твар дыхнула вільготным холадам. Можна было дадаць, што паветра, як і зазвычай восеньскаю парою, пахла сапрэлымі лісцямі, але ён гэтага не заўважыў, як не заўважыў мокрага неба, на якім не было ніводнае зоркі, як не заўважыў поўні, што зрэдчас адбівалася ў вялікай лужыне. Ён зірнуў уніз і адначасова здзівіўся і спалохаўся. Здзівіўся таму, бо ніколі не ўяўляў, што другі паверх — гэта ўсё-ткі даволі значная вышыня... Адначасна са здзіўленнем ён спалохаўся, бо вышыня яго заўсёды палохала, прынамсі з таго часу, як мінула дзяцінства, недзе з год пятнаццаці. Рашучасць адразу знікла, яе замянілі дрыжыкі ў каленях і нешта вельмі блізка падобнае да ванітавання. Чамусьці цяпер ён адчуў заўсёдны восеньскі пах: пах сапрэлага лісця. Цяпер ён убачыў поўню, што адбілася ў вялікай лужыне, якраз у той момант, калі ён зірнуў на лужыну. Пах падаўся яму непрыемным, поўня — злавеснай, а вецер — аж занадта халодным. Яму да смерці захацелася назад ва ўтульную закуранасць кватэры, але раптам адна здагадка прымусіла яго ўсміхнуцца. Ён узгадаў аднаго са сваіх сяброў, у якога быў кот, нават не кот, а, лічы, усё кацяня. Дык гэты кот самае малое разы чатыры звальваўся з форткі, а паверх у сябра быў пяты. Нічога кату не было...

Успамін пра ката крыху ўзняў настрой, і ў галаву прыйшла думка скокнуць на дрэва. Гэта яго ўзбадзёрыла, але, змерыўшы вокам адлегласць, зразумеў, што не дацягне і пляснецца жыватом...

Дзверы ў пад'ездзе ляпнулі, ён гэта добра пачуў. Іхні гук вярнуў яму былую рашучасць, і ўсё-ткі дзыгаць было боязна. Ён прысеў, павярнуўся і кінуў задам ногі з вакна, а рукамі ўчапіўся за падвоканне з унутранага боку пакою. Хоць трохі, але ніжэй. Ён павісеў такім чынам зусім нядоўга, але расціснуць пальцы так і не наважыўся. Да яго прыйшла ідэя, як зрабіць, каб да зямлі было яшчэ ніжэй. Ён адпусціў адну руку і тут жа ўхапіўся за бровачку, да якой мацавалася шыба, праўда, ён не быў упэўнены, што бровачка ўтрымае ягоную немалую, пад дзевяноста, вагу, але разважаць не было калі, і ён такім жа чынам перамяніў і другую руку. Цяпер ён — значна бліжэй да зямлі і можна дзыгаць.

Кім Секялевіч — так звалі шафёра — закурыў, бо лейтэнант зараз выйдзе, і тады ўжо доўга будзе не да курава. Тым больш, што пад папяросу думаць аб прыемным было яшчэ больш прыемна. А самым прыемным была ежа. Секялевіч ужо рыхтаваўся пагрузіцца ў салодкія мроі пра свежаніну, як нечаканна з-за рогу суседскага дома, быццам які зладзюга, вылецеў халодны вецер. Ён жорстка сцебануў шафёра па твары і руках, выхапіў з раптам саслабелых вуснаў папяросу, працягнуў яе крыху па асфальце, вытрахаючы знічкі, і шпурлянуў у лужыну. Аднекуль прыгнаў хмару і патушыў ёю і без таго слабое святло маладзічка. Зрабілася няўтульна, а вецер жангляваў сярод амаль голых сіротліва-чорных дрэваў, шурпата непакоіў апалую лістоту і гучна страляў незачыненаю форткай. Няўтульна зрабілася яшчэ і таму, што вецер умудрыўся прабрацца пад скуранае паліто і дастаць пад рэбры да самага сэрца, аж да вантробаў. Увесь свет напоўніўся рогатам, плачам, скрыгатам, енкамі, крыкамі, тупатам і звонам. I ўсё гэта імчала міма яго, турзала за рукі, за крысо паліто, зазірала яму ў вочы, крычэла ў вушы, казытліва лезла ў нос. Стала па-сапраўднаму страшна, і Секелевіч, каб пазбыцца страху, заспяваў...

Лейтэнант працягнуў руку да званка, але потым перадумаў і рашуча націснуў на дзвярную ручку. Дзверы, як ён і меркаваў, былі незачыненымі, адчыніліся яны без звыклага рыпення. Звычайна тыя насельнікі, да якіх візітаваў лейтэнант, мала клапаціліся пра знешні бок побыту. У калідоры было цёмна. Лейтэнант намацаў выключальнік і шчоўкнуў тумблерам: у сенцах нічога незвычайнага не было: акуратна састаўлены абутак, сцянная шафа для вопраткі, вялікае люстэрка. Яму раптам пакутліва захацелася ўспомніць нешта важнае, чаго ён, можа быць, і не ведаў, і гэтае балючае жаданне прымусіла яго спыніцца...

Ён ведаў, што яны ўжо на падыходзе, але, натуральна, ім не прыйдзе ў галаву абкружыць дом.

Ён расчыніў шыбу, паправіў на поясе меч і спрытна скокнуў на лапу арэхавага дрэва, што расло побач з домам, крыху павісеў на суку, саскочыў уніз на кукішкі, спружыніў і стрымгалоў паляцеў да сцяны. Сцяна з усіх бакоў абкружала дом і была даволі высокаю. Яна была заплеценая ў вінаградныя лозы. Ён лёгка ўскочыў на сцяну, лаза вытрымала ягоную вагу. Ён прабег тры вуліцы: Кавалёў, Вугальшчыкаў, Фурманаў. Там якраз за трэцяй хаткай начнога вартаўніка, што амаль прыляпілася да гарадскога мура, мелася брамка. За брамкаю яго чакалі: конь, грошы і свабода. Каня трымаў незнаёмы хлапец гадоў пятнаццаці, побач стаяла жанчына ўся ў чорным, і яна падалася яму знаёмаю, не зважаючы на тое, што твар ейны быў пакрыты чорным вэлюмам. Ён працягнуў руку і адкінуў вэлюм:

— Графіня?...

У вачах жанчыны былі слёзы.

— Графіня, я кахаю Вас, — крыкнуў ён ужо з каня і дадаў: — Няма мяне не возьмуць!

Ён ударыў каня ў бакі, а вецер ударыў яму ў твар, і неўзабаве ён ужо імчаў, не, нават ляцеў па полі. Кароткі плашч, разгорнуты ветрам, нагадваў крылы, і здалёк у паўзмроку вечара ён сам нагадваў дзіўную істоту: крылатага кентаўра.

«Яны мяне не возьмуць», — прашаптаў ён, але пальцаў не расціснуў. Хоць ён цяпер і бліжэй да зямлі, але дзыгаць баяўся.

Дзверы ў яго кватэры адкрыліся, ён добра пачуў тое, рашуча расціснуў пальцы і рухнуў уніз. Чамусьці стала светла-светла, столькі святла ён ніколі нават уявіць не мог, цэлае мора, цэлы акіян святла, і, што было самым дзіўным, гэтае святло зусім не рэзала па вачах. Ён ужо збіраўся ўзняцца, як раптам над ім нахілілася постаць з тварам чыстым-чыстым і вачыма, поўнымі незвычайнае цеплыні. I ён запытаў незнаёмца:

— Ты хто?

— Я — анёл.

— Ты адтуль?

— Адтуль.

Ён яшчэ знайшоў сілы, крыху прыўзняўся і, усміхнуўшыся, прашаптаў: «Яны мяне не возьмуць»...

Лейтэнант яшчэ раз зірнуў на аксамітавы лапік, намагаючыся ўспомніць нешта важнае, але не меў на тое ні часу, ні права — работа.

Прайшоў вузкім калідорчыкам у асветлены пакой, дзе парыпвала заезджаная кружэлка. «Развітальная», — суха адзначыў ён.

Стол быў завалены кнігамі і паперамі, як і звычайна ў падобных кватэрах. Ля адной сцяны — канапа з пледам і падушкай, у любы час можна прылегчы, супрацьлеглая ад канапы сцяна ўся ад падлогі да столі застаўлена кнігамі. Над канапаю павешаны даволі значных памераў жаночы партрэт, напісаны алеем. У вочы кідаўся смуткавы выраз прыгожага твару. Ля сцяны з кнігамі — зэдлік з прайгравальнікам. Лейтэнант яшчэ дадаў да ўбачанага: саморобную мапу Крыта над сталом і зусім невялічкую іконку Божае Маці, але гаспадара ў пакоі не было.

— На кухні, — скеміў лейтэнант і накіраваўся на кухню тым жа самым калідорчыкам. Твар сустрэў павеў халоднага ветру, а на кухні таксама было пуста, калі не лічыць звычайнага кухоннага абсталявання. Чамусьці адчыненую шыбу са слядамі ботаў на падвоканні лейтэнант заўважыў не адразу, а калі заўважыў, дык усё зразумеў, — яму нат не трэба было падыходзіць да вакна: усё і так было ясна.

Лейтэнант лятом зляцеў уніз, амаль не адчуваючы прыступак, і яшчэ з выхаду ў пад'езд крыкнуў шафёру:

— Секелевіч, за дом. Ну!

Шафёр, як апантаны, рвануў ад машыны, а лейтэнант пабег з другога боку. «Херня, возьмем!» — на бягу думаў ён, супакойваючы сябе. Ён рвануў на дарогу, але там было пуста і цёмна.

— Лейтэнант, сюды, — пачуў ён шафёраў голас, якраз з таго месца, насупроць якога свяцілася акно кухні. «Лейтэнант, не трэба бегаць, ён гатовы». Лейтэнант нахіліўся над целам і пацвердзіў:

— Так, гатовы. Такі пракол.

— Опоздали.

— Такой прокол.

— Что будем делать, товарищ лейтенант?

— Там есть кое-какие бумаги, их и подошьем к делу.

— Да...а. А труп-то к делу не подошьешь.

— Дело. Нам этого не простят.

— Не нам, а Вам, товариш лейтенант. Я только шофер: привез-увез.

Справы бралі вельмі кепскі накірунак, і трэба было нешта рашаць. У такіх выпадках заставалася толькі дзейнічаць хутка і рашуча, а разважаць потым. Звычайна гэты спосаб спрацоўваў. Секелевіч, працягваючы балбатаць, не заўважыў, як злосна бліснулі лейтэнантавыя вочы і як рэльефна вылучыліся да болю сціснутыя сківіцы.

— Ладно. Вот что: ты стой здесь и охраняй это и это, — лейтэнант паказаў на цела і заплечнік, што боўтаўся на дрэве, — а я пойду и вызову группу.

— Товарищ лейтенант, куда это Вы?

— Секелевич, ты идиот и фамилия твоя идиотская.

Гэта ўжо была правакацыя і крыўда, і шафёр сапраўды пакрыўдзіўся. Ён стаў набліжацца да лейтэнанта, пагрозліва нахіліўшы галаву, а правая рука пасунулася да адтапыранае кішэні.

— Товариш лейтенант... — далей фраза перайшла ў незразумелае булькатанне, бо вострая маланка нажа ўвайшла ў горла.

Секялевіч збялеў з твару, праўда, гэтага немагчыма было заўважыць з-за цемры, пахіснуўся і запаволена абсеў на зямлю. Лейтэнант злёгку падштурхнуў шафёра, і цела бясшумна склалася на зямлі, быццам наладоўваючыся спаць.

— Спі, алень, — ці то ўсміхнуўся, ці то ўзлаваўся лейтэнант.

Праз імгненне, быццам нешта прыгадаўшы, нахіліўся да трупа, пашарыў у кішэнях скуранога паліто: пісталет, чорны нататнік, партманэт. Потым рашуча скінуў з сябе сваё чорнае скуранае паліто і капялюш, і чорны бушлат з моцнае грубае тканіны з першага трупа змяніў гаспадара. Зірнуў на абедзьве ахвяры, але нічога не сказаў, толькі ўсмешкаю злавесна бліснулі белыя, зусім не чалавечыя зубы. Ён павярнуўся, і цемра звыкла і прагна глынула постаць. Толькі яшчэ нейкі час цішыня слухала крокі. Лейтэнант аддаляўся спачатку павольна, а потым усё шпарчэй і шпарчэй, пакуль хада не перарасла ў бег. Тэмп павялічваўся з кожным імгненнем. Вільгаць з усіх бакоў аточвала цела, але ён не заўважаў гэтае вільгаці, пакуль шматлікія пахі трапічнага лесу не ўварваліся ў нос і прыемна ўзбудзілі нервы. Надрыўна енчылі малпы, і з недалёкае ракі далятала важкае плёхканне алігатараў. Сцежка, выбітая аленямі, вяла да вадапою, дзе заўсёды была здабыча. Поўня, час ад часу выбіраючыся з-за хмараў, нечаканым прамянём высвечвала залацістую з чорнымі плямамі скуру, а потым імкліва хавалася за хмару, быццам спалохаўшыся фасфарычнага бляску круглых зялёных вачэй. Ягуар імчаў да вадапою, дзе яго заўсёды чакала здабыча з цёплаю крывёю ў венах і трапяткім пужлівым сэрцам...

Алена Гінько

Тузбіца

Тузбіца.
Пастаўшчына...
Вярба
Хіліцца да рэчкі-ручаіны...
Храм пакут маіх, мая журба,
настальгія,
мой выток адзіны.
Вёска — незабудка,
каласок,
рунь надзей
і поле успамінаў —
туліцца цнатліва да лясоў...
Корань дрэва — тут.
А дзе галіны?

...Сцежачка крывая на клады...
....
Сэрца, птушкай узляці да Неба!
Яркай знічкай азары брады,
лапік лесу,
вёску, поплаў, глебу.
Асвяці мне радасцю здаля
землякоў аблічча,
іх Святыні...

Тузбіца, пастаўская зямля, —
мой народ
ніколі тут не згіне.

***

Ляцець высока —
упасці нізка,
глядзець далёка —
убачыць зблізку.
Упасці —
і не падняцца,
убачыць —
расчаравацца.
Што лепей:
жаўрук?
сініца?
памерці ці нарадзіцца?

***

Прадчуванне блізкага дажджу —
быццам бы чаканне спавядання.
З ім хачу зацятасці іржу
змыць з душы , каб не было і звання.

Стоенасць прыроды данясе
да цябе патрэбу ачышчэння.
Ад праблем, што ўзычыў фарысей,
хочацца хоць нейкага збавення.

...І калі прарве на небе гром
гэтую затоеную роспач,
ты заплачаш ліўнем наўздагон,
ты з прыродаю пабудзеш поплеч.

...Вось і дыхаць стала ўжо лягчэй.
Вочы ўжо дабрэйшыя, не тыя.
Хоць на споведзь не хадзіла шчэ —
мне цяжар з душы залева змые.

Васількowы плач

...Ціша, спакой і гладзь,
роўнядзь. Ні ветру, ні буры.
...Мой васількowы плач
сціплы, але пануры.

Бачу яшчэ здалёк:
ён усплывае адчайна —
радасна-ярасны ўсплёск,
горка-салодкая тайна...

***

Ты рабіны не руш
і вярбы не чапай —
тут мой край, дзе мой сад, дзе мой гай.
Тут матуля жыла,
я шчаслівай была,
тут застаўся дзяцінства рай.

...Па-над берагам
шэра птушачка
завяла пераліўны жаль,
завярэдзіла
маю душачку,
а сама паляцела ўдаль.

Малітва

Божачка, дай мне сілы
вытраваць шквал нягод,
буру на лёс пахілы.

Зломлена, бы трыснёг,
вострым стаптана абцасам...
Што ж ты пакінуў, Бог?

Гэтак шукала святла,
сярод начэй блукала...
Я ж яшчэ й не жыла.

...Птушкаю паляту,
ў бездань нырну з адчаю...
Божачка, Божа, ратуй!

***

Я думала душой,
а быў патрэбны розум...
Я ж думала душой,
бо я была з табой.
Я думала душой,
адкінуўшы цвярозасць,
бо я жыла табой
і я была табой.
Я думала?..
Ды ну!..
Я ў мроіве лунала.
Цяпер сябе кляну
адну —
адну —
адну...

***

Я п'ю твой голас, як бальзам, —
ім поўняцца душы абшары...
Ці ласка боская, ці чары —
я п'ю твой голас — свой бальзам.

Пяшчотны голас — родны, твой!
Ён мне здаецца — салаўіным.
Растопіць ён трывог ільдзіны,
дзівосны голас — голас твой.

Такі і блізкі і чужы,
такі жадана-недасяжны...
Мне трэба чуць яго!
...Не важна,
што голас той — нібы з імжы.

Я п'ю яго, нібы нектар,
і захлынаюся ад прагі.
Баюся не спатоліць смагі.
І п'ю твой голас — божы дар.

Андрэй Козел

Цяпло

Калі змяшаюцца гады,
Калі наступіць цішыня,
Я буду помніць, што ёсць ты,
Ты будзеш помніць, што ёсць я.

Калі Зямля абрыне нас,
Калі запаліць нехта кнот,
Я буду ведаць гэты час,
Я не забуду гэты год!

Калі свой трэмар землятрус
Захоча здзейсніць пакрысе;
Калі забудзе беларус,
Што ён каму, куды нясе.

Калі сатруцца ў дробны пыл
Ўсе векавыя межы зла —
Адзін — пазнае, кім ён быў,
Другі — зазнае, кім быў я...

Абмаладжу свае гады
Зіхоткім полымем цяпла.
Я буду помніць, што ёсць ты,
Ты будзеш помніць, што ёсць я.

***

Я адпускаю
у былое,
тых, хто чужым
цяпер мне стаў.
Хто на пытанне:
«Ты са мною?..» —
Нічога мне
не адказаў.

І хто пайшоў
дарогай іншай
сярод мільёнаў
тых дарог.
Я тут не Бог,
трымаць каб лішніх,
і асуджаць
я тут —
не Бог.

***

Недапітая кава,
Недабіты ашчэпкі.

Не завершана справа:
Недалепкі — налепкі.

Не загоена рана,
Недапісаны вершы.
Недароблены кранам
Той паверх самы першы.

Не разбіта і шыба,
І акно не зашклёна.
Недалоўлена рыба,
Ліст не падае з клёна.

Недамараны мары,
І гузак не набіты.
Цвік надломлены мала
І яшчэ не забіты.

Недажатае жыта:
Каласы каласяцца.
А жыццё — не пражыта.
Дык чаго нам баяцца?

Таццяна Палхоўская

Ніткі

Сатканая з пахаў
І з ветру
З зямлі
З зялёнай коўдры
З надзеі вясны
З супакою стомы
З рэдкай гарачыні
З думак-рашэнняў
вымучаных знутры
З трывожных сноў
І пагрозлівых ранкаў
З размочаных у вадзе абаранкаў
Са стужкі часоў
Са стужкі для валасоў
З пераплеценых родных
і чужых галасоў
Са згарэлых дарог
Са змазоленых ног
З дотыкаў
Гукаў
Кавы ў начы
У цішы
У самоце
Самотная Я
сатканаЯ

***

У часе і прасторы
на белым лісце
кропляй крыві
застыла
мая
адзіная
краіна
бяры мяне за руку
пойдзем!
каб
убачыць сваімі вачыма
што
такое
яна
Родная зямля!

25 сакавіка 2012

Малітва

Малітва
Штодзённая і шэрая
Трывае
Шукаю сцежкі крылаў
На скамянелай
Спіне
Знікае
Да апошняга зломка
Натхненне...
Звар'яцелая
У прыцемках памкнення
Забылася на цішыню!
Падняў
Сам насам
Адрадзіў з пяску
Рука ў руку
Глядзіш у вочы
Падняць
Не маю моцы
Позірк
Калені
Слёзы
Валасы
Цалую ногі
Спапялі...
Пакінь адну
Сваю
Непратаптаную
Дарогу ў Неба

Са скарбаў нямецкай лірыкі

Гэтая паэтычная нізка — з кнігі «Die schonsten deutschen Gedichte aus acht Jahrbundersten» («Найлепшыя нямецкія вершы за восем стагоддзяў»), выдадзенай у Гамбургу ў 2010 годзе і тымчасова падараванай мне выдатным берлінскім перакладчыкам, вялікім сябрам нашай літаратуры, ганаровым сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў Норбертам Рандавым. Спадар Рандаў, аддаючы перавагу прозе, пераклаў творы Я. Коласа, М. Гарэцкага, В. Быкава, А. Кудраўца ды інш., глыбока разбіраўся і ў паэзіі — перастварыў вершы Я. Купалы, А. Гаруна, А. Разанава, моцна дбаў пра ўзаемапранікненне нямецкай і беларускай літаратур наогул. У асобніку анталогіі, перададзеным праз Уладзіміра Арлова, ён нават пазначыў тыя вершы, на якія мне варта звярнуць пільную ўвагу, і зрабіў прыпіску: «Дужа цікава было б прачытаць іх па-беларуску».

На маю скруху, я паспеў даслаць яму ці не адзіны пераклад, з Ф. Шылера: год таму — 1 кастрычніка — майго старэйшага сябра не стала... Дык няхай гэтая лірычная нізка — не толькі з элегічных матываў — будзе маім павінавачаннем, а перадусім — сціплымі кветкамі ў вянок ягонай светлай памяці.

Алесь Каско

Гайнрых ГАЙНЭ

Пытанні

Ля мора, дзе пуста, мора начнога
Дзябёлы стаіць юнак,
Спавіты тугою, працяты сумненнем,
І дрогкімі вуснамі пытаецца ў хваляў:
«О, развяжыце жыцця таямніцу,
Загадку, што мучыць адвеку
І гэтулькі ўжо галоў паламала, —
Галоў у вычварных шапках,
У турбанах і чорных барэтах,
У парыках і тысячу іншых
Бедных, спатнелых галоў, —
Скажыце, хто ён, чалавек?
Адкуль ён прыйшоў? Куды ён ідзе?
І хто жыве там, на зорах зіхоткіх?»
Мармычуць сабе безуважныя хвалі,
Дзьме вецер і гоніць аблокі,
Бліскаюць абыякава стылыя зоркі,
А дурань чакае адказу.

Дзе?

Дзе натомлены вандроўнік
Знойдзе вечны свой спачын?
Мо пад пальмамі на поўдні?
Або ў Рэйна на плячы?

Буду сам дзе пахаваны —
Між пяскоў чужой ракуі?
Ці мне сон наканаваны
Блізка з хваляю марской?

Там ці тут, нашто загадкі!
Бог паўсюль у вышыні,
А ўначы, нібы лампадкі,
Зорак хліпаюць агні.

Фрыдрых ГЭБЕЛЬ

Рэквіем

Душа, не пазбудзься іх,
Душа, не забудзь памерлых!

Зірні, яны ахінулі цябе
Дрогка, самотна,
І ў свячэнні святым
Любоўю іх ззяюць рукі;
Жаляцца яны і прагнуць
Наталіцца апошні раз
Сваім жыццём патухлым.

Душа, не пазбудзься іх,
Душа, не забудзь памерлых!

Зірні, яны ахінулі цябе
Дрогка, самотна,
І калі ты сябе астудзіш
Няіснасцю іх, яны застынуць
У нетрах бяздонных.
Тады ўскалыхне ноч бура,
І яны ад здранцвення збудзяцца,
Заўпарцяцца ў замку любові,
І пагоніць іх бура імклівa
Скрозь бязмежную пустку туды,
Дзе жыцця больш няма,
Дзе ёсць толькі змаганне
Сіл неўтаймоўных
За абнаўленне быцця!

Душа, не пазбудзься іх,
Душа, не забудзь памерлых!

Гуга фон ГОФМАНШТАЛЬ

Мусяць жыліцца адны да сконy
Доле, там, дзе вёслы цяжкіх вадаплаваў,
А другія ля руля над імі
Ведаюць і птушак лёт, і прастрань зорак.

Кон адных — у страху нерухомець
На пачатку блытаных жыццёвых сцежак,
Для другіх — напагатове крэслы
Поруч з каралевай ці сівілай,
І сядзяць яны, як быццам дома,
З лёгкай галавой і вольнымі рукамі.

Але ўсё-ткі плён някідкіх жыццяў
Пранікае ў жыцці гэтыя, другія,
І яднаюцца цяжар і лёгкасць
Так, як лучацца ў адно зямля й паветра;

Стомленасць народаў, спрэс забытых,
Скінуць не магу я са сваіх павекаў,
Мне не сцерці след з душы датклівай
Знічкі, што зляцела моўчкі з небасхілу.

Мноства лёсаў, як і мой лёс, ткуцца,
Іх з маім быццё сплятае наравіста,
І належыць мне тут больш, чым веку, —
Стрункасць полымя і ўзвіў трымклівай ліры.

Фрыдрых НІЦШЭ

Ессе Homo*

Так! Спазнаў я, хто, які я!
Полымя агню, стыхія,
Што паглыне сябе сама.
Ззяе ўсё, дзе я шугаю,
Тлен усё, што пакідаю:
Я агонь — тушыць дарма!

* Ecce Homo (лац.) — вось чалавек.

Самотнік

Імкне да стрэх
Гракоў крыклівая гурма:
Паваліць снег —
Там родны кут, бяды няма!

Што ж ты, прасцяк,
Уставіўся назад, у стынь?
Ці ж ёсць прасцяг
У свеце сцюжным і пустым?

Свет — бы атвор,
Да пусткаў тысячных вядзе:
Такі прастор —
Няма апірышча нідзе!

З пабляклых губ
Кляцьбу зрывае страх,
Ты дыму слуп,
Што ў неба цягне марны шлях.

Птушыны грай,
Хрыпі і доўжы свой палёт!
А ты хавай
Боль сэрца ў едкі смех і лёд!

Імкне да стрэх
Гракоў крыклівая гурма:
— Паваліць снег!
Бязродным сховішча няма!

Райнер МАРЫЯ РЫЛЬКЕ

Ева

Сціплая, яна ў святле саборным
Туліцца пад вітражом высокім
З яблыкам, налітым спелым сокам,
Праз які калісь спазнала сорам

І якім раскрыла часу код
Коштам страты вечнасці і раю, —
З першым адтаемненым «кахаю»
На зямлю сышла, бы юны год.

Ах, як ёй хацелася б назад,
Да суладнасці жыцця былога,
Дзе ўсялякі звер ёй быў як брат.
Даў мужчыну ёй дзівосны сад,
З кім пранікла ў смерць, а ў вечнасць Бога
Ледзь-ледзь скіравала свой пагляд.

Хрысціян МОРГЕНШТЭРН

За мноства

Шмат красы на свеце гэтым
Сціплай, ды жывой;
Спасцігаю — і ўсё больш паэтам
Я раблюся; цешуся красой
Тою, што не церпіць шуму, тлуму,
Што на дне душы людской і той,
Што абвейвае зямлю парой
Квеценню, бы ўсмешкамі між суму.

Містэрыя

Ткаўся ўпотай пас прарочы,
І няведамая сіла
Нашы дні і нашы ночы
У адно жыццё злучыла.

Двайнікамі, спарышамі
Сталі мы, а пас не трэцца:
Ужо зіркае над намі
Палымяна нехта трэці.

Фрыдрых ШЫЛЕР

Надзея

У думках і словах, у сненнях людскіх
Спадзеву на лепшае многа.
Да мэты шчаслівай, да дзён залатых
Ляціць іх лятунак-дарога.
То старыцца свет, то ён зноў малады,
Але чалавек спадзяецца заўжды.

Надзея вядзе ад пачатку шляхоў, —
З падлеткамі рада вітацца,
Таемнасцю поўніць яна юнакоў
І не памірае са старцам;
Няхай да магілы ўсяго толькі крок,
Ды цепліць надзея зняможаны крок.

Не, гэта не сімвал, пусты і нямы,
Што мозг спараджае збалелы.
У сэрцы не моўкне: для лепшага мы
Прыходзім у свет гэты белы.
І як ні шчыміць у ім жалю струна,
Не чуе душа: спадзяецца яна.

Мальтыйская цішыня

(Падарожныя нататкі)

Ганна ЯНКУТА

Фота аўтара

Дарога ад Меліхі



Хаджар-Кім

Сярэдзіна дня, сонца ў самым зеніце, але спёка пераносіцца лёгка дзякуючы прахалоднаму ветру, які рэзка кантрастуе з гарачымі прамянямі.

Павевы ахаладжваюць скуру, па ёй нават час ад часу прабягаюць дрыжыкі, і таму незразумела, патрэбная вятроўка ці не. Кажуць, летам тут зусім горача, уся расліннасць выгарае і востраў ператвараецца ў невясёлае відовішча, але цяпер, у сярэдзіне траўня, фенхель яшчэ зеляне, а апунцыя ў жоўтых кветках, хаця ў цэлым краявід разнастайнасцю фарбаў не радуе: шэрыя скалы, бляклая трава, асобныя зялёныя плямкі і сіняе мора, якое бачнае тут амаль з любой высокай кропкі. Спачатку гэты пейзаж захапляе, але хутка пачынае надакучваць, бо куды ні пойдзеш — паўсюль тое самае. Прыгожа і аднастайна.

Я крочу прасёлкавай дарогай, выбіраючы па карце найкарацейшы шлях ад Айн-Туфіхі да Мджара. Падарожжа гэтае хутчэй вымушанае, чым добравольнае: аўтобусны рух на Мальце арганізаваны так, што трапіць з аднаго горада ў другі атрымліваецца не заўсёды, нават калі яны ляжаць побач. Прайшло даволі шмат часу, перш чым я навучылася разлічваць зручныя маршруты і не давяраць раскладам, вывешаным на прыпынках: калі аўтобус ходзіць раз на гадзіну ці дзве, гэтыя ўменні аказваюцца вельмі карыснымі. Пакуль жа я гляджу ў карту, спадзеючыся, што так ці інакш з аднаго населенага пункта ў суседні я дабяруся, у крайнім выпадку заўсёды можна пайсці пехам, бо на востраве даўжынёй у 30 кіламетраў непераадольных адлегласцяў быць не можа, нават нягледзячы на рэльеф. Дарогу амаль заўсёды можна зрэзаць, напрыклад, спускаючыся з гары не серпанцінам, а стромкімі наўпроставымі сцяжынкамі, калі, зразумела, атрымаецца своечасова іх знайсці. Гэтым разам я таксама вырашаю скараціць шлях, павярнуўшы ля рэштак рымскіх лазняў на вузенькую сцяжынку, якая мусіла неўзабаве правесці мяне каля маленечкага палаца Замітэла і вывесці на прамую дарогу на Мджар.

Дарогі Мальты ў большасці сваёй звілістыя нават тады, калі ідзеш па іх пехатой, а не едзеш аўтобусам. Яны ўвесь час караскаюцца на нейкі пагорак ці агінаюць яго, нярэдка ўзбіраючыся на сур'ёзную вышыню над узроўнем мора. Часам гэта самы сапраўдны серпантын, як напрыклад, дарога, што вядзе ад Шэмшы да Меліхі, курортнага гарадка, які ў адрозненне ад іншых знаходзіцца не на ўзбярэжжы, а над ім і славіцца адным з найлепшых пляжаў вострава. Узлятаючы серпанцінам над далінай Містра, справа бачыш палац Сельмун — невялікі, як і ўсё тут, будынак, з выгляду вельмі сярэднявечны, але насамрэч узведзены ў XVIII стагоддзі. У адзін са сваіх першых дзён на Мальце я дабралася да яго прасёлкавай дарогай з Меліхі, як звычайна, пехам, бо аўтобусы туды ходзяць вельмі рэдка, да таго ж быў вечар і расклад не пакідаў ніякіх надзеяў. Дарога была пустынная, і нават ля палаца — а цяпер гатэля — я не сустрэла нікога, апроч некалькіх катоў, якіх на востраве вельмі шмат. Хутка пачало цямнець і, адпаведна, халадаць, і я вырашыла пашукаць карацейшы шлях, каб выйсці на серпанцін бліжэй да сярэдзіны спуску, а не на самым версе, то бок на выездзе з Меліхі. На шчасце, паміж агародамі, што прыступкамі сыходзілі з гары, яшчэ можна было разгледзець сцяжынку, відавочна дагледжаную і прыстасаваную для зручнага руху, а там, дзе сцяжынак і агародаў не было, можна было прайсці проста па камяністым схіле. Вось і шасэйная дарога з прыпынкам, акурат тут аўтобусы ходзяць часта, бо гэта асноўная сувязь большай часткі вострава з паромам на суседні востраў Гоза, галоўнае — паспець своечасова заўважыць аўтобус, калі ён выныране ў сутонні з-за павароту, і паказаць сябе кіроўцу, бо інакш ён не спыніцца, транспарт на востраве спыняецца толькі на патрабаванне.

Людзі на Мальце вельмі гаваркія, хоць спецыяльна самі ў размову не лезуць. Але ўжо калі зачэпішся з імі языкамі, ахвотна будуць адказваць на пытанні пра сваю краіну і распытваць пра тваю. Вось і цяпер, паказаўшы кіроўцу праязны, я ўголас здзівілася, што пасажыраў апроч мяне ў аўтобусе амаль няма, і кіроўца, малады хлопец, весела падтрымаў размову, пачаўшы з таго, што турыстычны сезон яшчэ не адкрыўся і плаўна перайшоўшы да свайго дзяцінства на Гоза. Дазнаўшыся, што я кожнага ранку купаюся ў моры, ён вельмі здзівіўся, маўляў, яшчэ ж халадна, але калі я расказала пра нашу анамальна доўгую зіму 2013 года, калі снег сышоў толькі ў канцы красавіка, ён ледзь паверыў.

— Гэта ж у вас там снег, мароз, няма мора і адны лясы, азёры і раўніны? — перапытаў ён, падсумоўваючы атрыманыя звесткі.

— У вас тут таксама дзіўна, — адказала я. — Каб трапіць у суседнюю краіну, трэба ляцець самалётам ці плыць па моры.

— Я за мяжой не бываў, — пацінуў плячыма кіроўца. — Навошта?

Рэшткі рымскіх лазняў, якія я ўбачыла па дарозе з Айн-Туфіхі ў Мджар і ля якіх мусіла павярнуць са зручнай узбочыны і камяністымі пагоркамі рушыць да палаца Замітэла, аказаліся адным з тых неверагодных мальтыйскіх месцаў, што зацікавіла мяне не як аб'ект турыстычнага паломніцтва, а хутчэй самім фактам свайго існавання. На невялікім абнесеным плотам кавалку зямлі — закансерваваныя купы камянёў, рэшткі падмурку, будаўнічае смецце: усё гэта нагадвае раннюю стадыю будоўлі нейкага з тых дамкоў, якія хутка з'явяцца на маім шляху, з адной толькі розніцай — гэты падмурак і гэтыя камяні засталіся тут ад рымлянаў. Рымскі будаўнічы друз, амаль зніклая руіна нічым не выбітных лазняў, якія амаль выпадкова не былі дарэшты расцяганы на будаўніцтва тых самых суседніх лецішчаў і дамкоў ці на каменныя агародкі ўздоўж большасці вялікіх мясцовых дарог — цікава, колькі рымскіх лазняў і мегалітычных храмаў існуе цяпер у выглядзе такіх агароджаў? — і якія дзякуючы гэтай выпадковасці не толькі абнесеныя плотам («Уваход забаронены, выбачайце, у нас рэстаўрацыя»), але і адзначаныя на карце. З аднаго боку — шараговая рэштка, каштоўныя выключна сваёй вытрымкай, з другога — помнік гісторыі і археалогіі такой даўніны, што і ўявіць страшна, а побач — лецішчы і дарога, і нікога навокал. Я спакойна магу прабрацца праз плот і забраць кавалачак Рымскай імперыі з сабой, правесці яго праз мытны кантроль у аэрапорце і прывезці дадому, і ніхто пра гэта не даведаецца. Магчыма нават, я магу паставіць тут намёт і правесці ноч на рымскіх развалінах. Сама думка пра такую блізкасць да гісторыі здаецца неверагоднай. Яшчэ больш неверагодным здаецца мне яна цяпер, калі амаль праз год пасля вандроўкі я шукаю ў інтэрнэце інфармацыю пра рымскія лазні Айн-Туфіхі і разумею, што сярод усяго гэтага друзу археолагі знайшлі яшчэ і мазаікі, а таксама здолелі вызначыць, чым былі выкладзеныя падлогі ў калідорах і прыбіральнях.

Турыстычных месцаў, якія маглі б пахваліцца натоўпамі наведнікаў і ля якіх даводзіцца стаяць у чарзе толькі дзеля таго, каб зрабіць удалы кадр, на Мальце не так ужо і шмат. Агенцтвы на ўзбярэжжы запрашаюць у Валету і суседнія рыцарскія гарадкі, кожны з якіх істотна меншы па плошчы за Сухарава ці Чыжоўку, на востраў Каміна з вежай святой Марыі, больш вядомай як замак Іф з экранізацыі «Графа Монтэ-Крыста», і на востраў Гоза з найстарэйшымі каменнымі пабудовамі ў свеце, у старадаўні поўны турыстаў «горад цішыні» Мдзіну і ў вандроўку па мегалітычных храмах вострава ці, прынамсі, па самых знакамітых і лёгкадаступных сярод іх. Куды б ты на Мальце ні трапіў, тут няма таго адчування пастаяннага свята, якое суправаджае цябе ў падарожжах па вядомых турыстычных мясцінах. Безумоўна, і ў Валеце, і на ўзбярэжжах ёсць сувенірныя крамкі, безліч рэстаранчыкаў, людныя маршруты і вуліцы, нейкія клубы і тэнісныя корты пад адкрытым небам, — і ўсё ж цябе ні на імгненне не пакідае адчуванне, што ты калі не на задворках свету, то прынамсі на задворках Еўропы, што далей ужо толькі Афрыка і што тут заканчваецца вядомае табе і зразумелае. Вуліцы з жоўтага каменю, ці не кожныя два дамы з дзесяці выстаўленыя на продаж, паўсюль пакеты са смеццем — іх цягам дня забярэ спецыяльная машына, — шыльды на адзінай семіцкай мове, якая карыстаецца лацінскім алфавітам, але больш зразумелай ад гэтага не робіцца, і гэтая дзіўная травеньская спёка, калі кожны павеў з мора прабірае цябе да касцей.

— Вы адкуль? — пацікавіўся абаяльны мальтыец, гатуючы мне замоўлены гамбургер.

— З Беларусі, — адказваю я і з характэрнай для нашых шырот сціпласцю дадаю. — Вы пра такую краіну, мабыць, і не ведаеце.

— Ну канечне ж ведаю! — радасна крычыць мальтыец. — Я ж гляджу «Еўрабачанне»! Сёлета вашыя выступілі нічога так, але я ўсё адно заўзею за сваіх.

Мяне моцна ўразіла маё першае сутыкненне з непараднымі славутасцямі Мальты. На карце Буджыбы, курортнага гарадка, у якім я жыла, я заўважыла незвычайны аб'ект: катакомбы Саліны, і адразу ж вырашыла да іх прагуляцца. Гэта адзінае такога кшталту месца ў ваколіцах Буджыбы, я нават не стала разбірацца, едзе туды аўтобус ці не, і адразу пайшла пехам, тым больш што па дарозе ляжаў мемарыяльны парк Кенэдзі. Паварот на вёсачку Саліна запомніўся мне латкам з мясцовай садавінай і агароднінай — такія сустракаюцца тут на кожным кроку, прычым асартымент за рэдкімі выключэннямі аднолькавы і не надта разнастайны. Далей — маленечкая царква Дабравешчання, а праз дарогу, мяркуючы з карты, мусяць быць катакомбы. Я прайшлася па ўзбочыне, баючыся парушыць межы чыіх-небудзь прыватных уладанняў, але нічога асаблівага не ўбачыла: поле, пратаптаная сцяжынка, нейкі шчыт. Рызыкнуўшы падысці бліжэй, я прачытала змешчаны на ім надпіс, які паведамляў, што перада мной уласна і ляжаць катакомбы Саліны, і прасіў не вельмі тут смеціць — усё ж гістарычная каштоўнасць. І зноў нікога. Пустыя выбітыя ў камні нізкія памяшканні, акуратна складзеныя вонкі камяні, зараснікі апунцыі — усё гэта нагадвае дзіўныя падземныя дамкі, зусім нядаўна пакінутыя гаспадарамі, яшчэ даволі абжытыя і амаль утульныя і ў той жа час абсалютна абязлюдненыя. Трошкі пахадзіўшы ля ўвахода, агледзеўшыся і зазірнуўшы ў прахалодныя лёхі, я павярнула назад, да горада.

Спыніўшыся ля латка і ўбачыўшы сярод банальных персікаў, таматаў чэры і цукіні адзіны невядомы мне гатунак садавіны, я спытала ў прадаўцоў, што гэта такое. Прадаўцы, відаць, муж і жонка, збянтэжана пераглянуліся і адказалі:

— Мы не ведаем, як гэта называецца па-англельску.

Збянтэжанасць іх была зразумелая: на Мальце ўсе без выключэння свабодна гавораць па-ангельску, і, відаць, мясцовыя жыхары нячаста трапляюць

у сітуацыю, калі не могуць нешта патлумачыць турысту.

— Тады скажыце, як гэта будзе па-мальтыйску.

Яны засмяяліся і сказалі, але я не запомніла, каб потым паглядзець у слоўніку. Толькі праз некаторы час я даведалася, што гэтыя невялікія аранжавыя кісла-салодкія плады «па-нашаму» называюцца мушмулой.

Сцяжынка ад рымскіх развалінаў, якая спачатку здавалася надзейнай, прычым надзейнасць гэтую кампетэнтна пацвярджала карта, усё больш губляецца сярод лецішчаў: часам здаецца, што яна вось-вось зьнікне, вывеўшы мяне папярэдне на чыйсьці падворак. Нягледзячы на добрае надвор'е, людзей на лецішчах няма, магчыма, таму, што будні дзень, альбо дачны сезон на Мальце пакуль не пачаўся, альбо яшчэ нешта. З палацам Замітэла карта таксама крыху памылілася: аказалася, ён знаходзіцца пад самым Мджарам, ужо на падыходзе да горада, амаль на сантыметр правей, чым намалявана, а я ўжо паспела змірыцца з тым, што прапусціла яго па дарозе, пераблытаўшы з якімсьці дачным домікам. Але адзінае, з чым яго сапраўды можна было пераблытаць, — гэта царква Дабравешчання ў Саліне: тая ж прастата, той жа мінімум упрыгожанняў і тое ж бязлюддзе.

Ад палаца Замітэла да самога Мджара ўжо зусім недалёка, і цяпер арыентавацца можна не па карце, а па купале касцёла, што размешчаны на ўзвышшы і таму бачны з ускраінаў горада, больш чым сціплага па плошчы. Згубіцца ў мальтыйскім горадзе амаль немагчыма: у Валеце, напрыклад, на любой вялікай вуліцы, якая не заканчваецца тупіком, ты бачыш яе пачатак і канец — наперадзе мора і ззаду мора, горад праглядаецца наскрозь. Нават калі горад месціцца не па паўвостраве, прайсці яго ўздоўж ці ўпоперак — справа нядоўгая шпацыру, пры жаданні вакол Буджыбы можна бегаць ранішнія кросы, і невядома яшчэ, ці хопіць аднаго кола для добрай размінкі. Ад цэнтральнай плошчы —маленькай і ўжо зусім не пустыннай — дабрацца да Та'Хаджрата (а менавіта ён — мэта маёй сённяшняй вандроўкі) проста: паміж указальнікамі на бібліятэку і мясцовую клініку ёсць і ўказальнік на гэты мегалітычны храм. Прайшоўшы яшчэ трошкі па галоўнай вуліцы горада, я, кіруючыся ўказальнікамі, паварочваю за рог і неўзабаве аказваюся перад высокай агароджай. Горад тут заканчваецца і пачынаюцца пагоркі і палі, тыповы камяністы пейзаж Мальты. Шыльда на агароджы паведамляе, што ўваход на тэрыторыю мегалітычнага комплексу Та'Хаджрат адчынены не кожны дзень і не ў любы час, але нічога страшнага: праз пруты агароджы ўсё бачна вельмі добра. Даводзіцца абысці комплекс збоку, каб лепей разгледзець храм, прайсціся па полі, на шчасце, нічым не засаджаным, вось ён, дальмен, вось крушні камянёў, тут і там абсаджаныя чымсьці дэкаратыўным, руінам — больш за пяць тысяч гадоў. Рэшткі гэтай пабудовы такія старажытныя, што мы ўжо ніколі не дазнаемся, якой яна была насамрэч і як выглядалі людзі, якія да яе прыходзілі, і што яны тут увогуле рабілі. Меру такой старажытнасці ацаніць амаль немагчыма: гэта як глядзець на горы і ўяўляць, што калісьці яны былі маладымі. А таму гэтыя камяні, як і руіны рымскай лазні, выклікаюць змяшаныя пачуцці: з аднаго боку, гэта проста шэрыя пліты, складзеныя літарай «П», з другога — існуюць неабвержныя сведчанні, што калісьці тут віравала жыццё, і іншыя людзі, аддзеленыя ад цябе сотнямі пакаленняў, надавалі гэтай літары немалое значэнне.

Та'Хаджрат захаваўся горш, чым падобныя да яго комплексы Таршын ці Мнайдра, але, магчыма, па праве першынства запомніўся мне найбольш. Няма сумневу, што навукоўцы з першага погляду знойдуць паміж гэтымі комплексамі безліч адрозненняў, вызначаць прыкладны час пабудовы і размяжуюць іх функцыі. Для недасведчанага ж назіральніка ўсе гэтыя храмы — не больш як груды старажытных камянёў: дзесьці захаваліся даўнія арнаменты і больш разнастайныя інтэр'еры, як ні дзіўна гучыць гэтае слова ў дачыненні да такіх пабудоў, дзесьці археолагі знайшлі рэшты жывёльных і чалавечых костак, дзесьці дагэтуль можна пабачыць узоры каменнай мэблі эпохі неаліту. Да іх, як і да мальтыйскіх пейзажаў увогуле, хутка прызвычайваешся і глядзіш ужо як на нешта шараговае, пачынаеш звяжаць хутчэй не на самі камяні, а на навакольныя краявіды: комплекс Мнайдра, які знаходзіцца непадалёк ад мора сярод шырокага прастору ды яшчэ і ў палове кіламетра ад іншага комплексу пад назвай Хаджар-Кім, у гэтым плане нашмат цікавейшы за лабірынты Таршына, дзе і людзей нашмат больш, і дамы на заднім фоне робяць само старажытнае відовішча куды менш урачыстым.

Дзіўна думаць пра тое, чаго ў падарожжах шукаеш найперш: агульных уражанняў, прыгожых ландшафтаў ці новых уяўленняў пра свет. Магчыма, спрабуеш збегчы ад звычных краявідаў, каб там, у незнаёмым месцы, адчуць сябе кімсьці іншым, назбіраць калекцыю свежых успамінаў, якія дапамогуць апраўдаць шэрае існаванне ва ўсе астатнія дні. Але гэтыя думкі здаюцца лішнімі, калі аказваешся на іншым канцы свету і на некаторы час ўпісваешся ў чужы быт: усё ў выніку застаецца такім самым, нягледзячы на змену дэкарацыяў. Хіба што калекцыя ўражанняў папаўняецца — і таму, відаць, у турыстычных і не вельмі краінах з'яўляецца ўсё больш і больш дзівачных месцаў, музеяў і забаваў. Уражанні збіраюцца дзе заўгодна — падчас наведвання мегалітычных храмаў ці бадзянняў нікому асабліва не цікавымі сцежкамі ў ваколіцах Айн-Туфіхі, іх можна злавіць, седзячы на камянях на выездзе з Меліхі ці плывучы паромам у Валету, фактычна — кожнае імгненне, калі толькі надаеш гэтаму значэнне, — і потым гэты груз уцягнецца з намі далей. Збіраць уражанні лягчэй, чым кнігі на паліцах ці посуд у сервантах, і яны не прывязваюць нас да месца, а толькі да пастаяннай змены месцаў, што ў выніку таксама нас укараньвае — у гэтае няпэўнае, хісткае існаванне.

І ўсё ж самы цікавы тып мальтыйскіх помнікаў застаўся гэтым разам па-за маёй увагай. Гэта так званыя «каляіны», невядома калі і кім пракладзеныя ў розных месцах вострава, што ўтвараюць своеасаблівую старажытную «транспартную сетку», ці то выбітую дзеля арашэння камяністых палёў, ці то выціснутую коламі калёсаў, што перавозілі пліты для мегалітаў. Прасцей за ўсё каляіны знайсці ў горадзе Сан-Джуан, дзе ў дапамогу турыстам расстаўленыя ўказальнікі, нашмат складаней дабрацца да іх у Мтарфе — месцы надзвычай нетурыстычным, хоць адсюль да аднаго з самых папулярных на Мальце гарадоў Мдзіны як рукой дастаць. Праз адсутнасць хоць нейкіх указанняў на каляіны, а яшчэ праз тое, што мясцовыя жыхары нават не ўяўляюць, што знаходзіцца ў суседнім горадзе і двары, пошук каляіны ў Мтарфе можа ператварыцца ў нялёгкую задачу. Спачатку мне давялося знайсці ледзь прыкметную сцяжынку, што вяла праз поле ад Мдзіны і прылеглага да яе Рабату да Мтарфы, потым пакружыць па некалькіх кварталах, каб урэшце наткнуцца на ўказальнік, але так і не зразумець, куды ён скіроўвае. Тады я вырашыла распытаць мясцовых жыхароў. Прыязная гаспадыня цырульні (якая, як выявілася пазней, стаяла амаль ля самай мэты маіх пошукаў) няпэўна махнула рукой кудысьці ўбок і з усмешкай сказала: «Дзесьці там, здаецца, але я дакладна не ведаю». Прадавачка ў прадуктовай краме на суседняй вуліцы вельмі хацела дапамагчы, але не магла прыдумаць, як.

— Разумееце, сама я не адсюль, а таму не ведаю, што тут ёсць і дзе... — яна збянтэжана азірнулася, нібыта шукаючы, хто б мог нам нешта парадзіць, і знайшла! Паклікаўшы па-мальтыйску аднаго з наведнікаў крамы і, нешта ў яго спытаўшы, зноў па-ангельску звярнулася да мяне:

— Пачакайце, калі ласка, зараз ён расплаціцца і адвядзе вас.

Майго новага правадніка вельмі турбаваў лёс занядбаных помнікаў мальтыйскай гісторыі.

— Зразумела, што ўлады выдзяляюць грошы на захаванне такіх вялікіх мясцінаў, як Мдзіна. Але ж ёсць і больш дробныя помнікі, іх таксама трэба ахоўваць! Гэта ж наша гісторыя, гэта таксама каштоўнасць, хоць сюды і не наведваюцца турысты. А гэтыя каляіны хутка ўвогуле будуць знішчаныя. Хутка вы самі ўсё пабачыце.

Ён прывёў мяне ў суседні двор, міма якога я разоў пяць ужо праходзіла, і паказаў на ім ледзь прыкметныя рэшткі дагістарычных каляінаў, прыгаворваючы бедаваць, што дзяржава ніяк пра такія нязначныя тысячагадовыя помнікі не клапоціцца. Ніякай шыльды, хай сабе і такой малапрыкметнай, як ля катакомбаў Саліны, тут не было, і ўсё ж пустая пляцоўка сярод дамоў і агародаў не забываная і выкарыстоўваецца, відаць, толькі як паша.

Але самыя цікавыя каляіны можна пабачыць у ваколіцах скалаў Дынглі на поўдні вострава. Там яны ўтвараюць ці не галоўны старажытны транспартны вузел, і ўсё ж турыстаў у тых мясцінах няма, бо дабрацца туды сваім ходам можна хіба што прайшоўшы нямала кіламетраў пехатой і сустрэўшы па дарозе толькі некалькі такіх жа вар'ятаў, якіх таксама вабяць доўгія прагулкі па пустынных ускрайках вострава. Вялікі кавалак зямлі ўздоўж і ўпоперак разрэзаны парнымі жалабкамі, ва ўсім гэтым сапраўды ёсць нешта ад вялікага чыгуначнага вузла, вось толькі даўно закінутага і забытага, навокал — шэрыя ўзгорыстыя раўніны, вецер нязменна пранізлівы.

— Вы згубіліся? — пацікавілася старэнькая пані, калі я, адышоўшы ад мегалітычнага комплексу Та'Хаджрат у Мджары, разглядала пасярод вуліцы карту і думала, да якога аўтобуснага прыпынку бліжэй. — Можа, вам дапамагчы?

Мальта — папулярнае месца для эміграцыі заможных брытанскіх пенсіянераў, якія хочуць прабавіць рэшту старасці ў прыемным міжземнаморскім клімаце і пры гэтым сярод людзей, якія ўсе да аднаго размаўляюць на іх мове.

— Я шукаю аўтобусны прыпынак.

— Дайце мне вашу карту, я пакажу, як бліжэй.

Дабрацца з Мжара дадому — то бок да Буджыбы — аказалася нашмат прасцей, чым прыехаць сюды: расклад на прыпынку тлумачыць, у якія гарады ідзе транспарт. Некаторыя з іх я добра ведаю — яны рэгулярнымі лініямі звязаныя з месцам, дзе я жыву. Паводле карты, такі маршрут аказваецца нашмат даўжэйшым, але час, затрачаны на вяртанне, пераконвае, што часам карта маніць яшчэ больш, чым я думала. Давяраць карце — адна з самых прыемных памылак у вандроўцы, прынамсі ў маім выпадку. Гэта амаль як давяраць прагнозам надвор'я, толькі прастываеш радзей. За вокнамі — усё той жа шараваты ўзгорысты ландшафт з зялёнымі плямамі заразнікаў апунцый.

Паціху бярэцца на вечар.

Валета

Палац Замітэла

Велікодны кошык

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

Дзівосны музей

— За кальцавою аўтастрадай
На ўскрайку гаманкой сталіцы
Музей нязвыклы
вельмі рады
Быў ва Уруччы
прытуліцца.

Па ім не толькі уручанцы
Выходзяць на шпацыр, бы ў парку,
Тут і французы,
і брытанцы,
Бывае, ладзяць прагулянку.

Адзін куточак тут названы
«Калекцыяй пет-ра-глі-фіч-най».
Мо добра,
што яго на мапах
Няма пакуль што турыстычных.

Тут валуны,
як экспанаты,
Краіны нашай склалі карту.
З палёў,
з лясоў
яны прыняты
Каб тут паўстаць каменнай вартай.

Ледавікі іх,
як на санках,
Са Скандынавіі прывезлі
Ў падмуркі замкаў,
сцены,
ганкі...
Ў млынах спяваць і жорнаў песні.

Ў музеі пад адкрытым небам
Няма касіркі пры ўваходзе
Вартаўнікі тут —
без патрэбы:
Цяжкі камень
не скрадзе злодзей.

Спяць валуны пад коўдрай снегу.
Сноўборды,
тазікі
і лыжы
Нясуць з гары...
Вясёлым смехам
І воклічамі
цішу
крышым.

Музеем-дзівам ганаруся,
Бо цуд такі —
кажу вам смела —
Ёсць толькі ў нас,
у Беларусі,
І больш нідзе
ў Еўропе цэлай.

Цмок Уручанскі

У мікрараёне мінскім
Цмок,
Як добры чараўнік,
Пасяліўся без прапіскі
На адлігу сакавік.

Мо прытупаў ад Нямігі
У зацішлівы лясок
Патлумачыць нам на мігах,
Што ён свойскі дзядзька-цмок,

Не зласлівы,
А рахманы
Трохгаловы велікан,
Што ніколі не падмане
Маладзенькіх гараджан.

Крылы трэ яго «на шчасце»
Шчабятлівая дзятва,
Раніцой вітае часта
З дома нумар 32.

Як цікаўнае сініцы
Пры музейных валунах,
Ён мне часам нават сніцца
У салодкіх мройных снах.

Можа, праўда
Паўз аптэку
Свежых пагартаць газет
Ходзіць у бібліятэку,
Зазірнуць у інтэрнэт —

Вызнаць цмокавы навіны
Пра далёкіх сваякоў
З Англіі ды з Украіны,
Пра сяброў-палешукоў...

Шэсць вачэй, —
Дык пільна сочыць
Нібы строгі педагог.
Бараніць дзятву ахвочы:
Ён бацькам спакой збярог.

Малюнак Алены Карповіч

Велікодны кошык

Нам з сястрой сказала мама Рая:
«Сонейка купаецца і грае!

З кубка, у якім ляжыць яечка,
Умывайцеся, мае сардэчкі!»

Соль, ваду і маляванкі ў храме
Асвяціла мамка золкім ранкам.

— Выбачай, цябе не возьмем, кошка,
Не табе падрыхтавалі кошык!

На Вялічка для бабулі роднай
Мы збіраем кошык Велікодны.

Пасху з тварагу, разынак, маку
Пакладзем
Ды іншыя прысмакі.

Наладуемся як след,
А потым
На аўтобусе паедзем «сотым»...

Бабу Ліду тройчы пацалуем,
Ад яе «Хрыстос уваскрос!» пачуем,

«Уваскрос напраўду!» ёй адкажам
І ручнік на кошыку развяжам,

Стол накрыем і зацеплім свечку,
Прачытаем «Ойча наш» адвечны...

Будзем з ёю у біткі гуляцца,
Сочывам, вяндлінай разгаўляцца,

Запіваць гарбатай джэм з маліны
І расказваць школьныя навіны,

Слухаць казкі і развучваць песні
Пра Любоў, якая уваскрэсла...

Балельшчык

— На трыбуннай белай лаўцы,
Жодзінцы
ці багуслаўцы.
Падтрымаць прыйшлі мы з дзедам
Калектыў «БелАЗ-Тарпеда»,
Дык крычым
што маем сілы:
«Шайбу!»,
«Гол!»,
«Суддзю — на мыла!»
Я не проста так аматар —
Зацікаўлены заўзятар.
Сярод нашых —
тата з братам.
Тата — трэнер,
братка — майстар
Пас аддаць,
прайсці па флангу,
Важны мяч забіць ад штангі.
Не баімся ветру,
сцюжы —
Трэба нам
«БАТЭ» адужаць!
Марым стаць
найлепшым клубам
Выйграць беларускі Кубак,
Пазмагацца
з «Барселонай»
Ў Кубку
еўрачэмпіёнаў!

Нуль

З Яна Бжэхвы

Нуль каціўся шашою:
— Прэч! Не бачыце, хто я?
Важу я на сто тысяч!
Драбната, разыйдзіся!
Я адзін у прыродзе,
Сам з сабою ў згодзе!

Выхваляўся заўзята,
Што ён гэткі пузаты.

Ды прамовіў хтосьці ціха:
— Дзе трыбух, там і пыха!
А калі ўжо без жартаў:
Нуль — нічога ж не варты!

Асыпаецца лістота

З невядомага польскага аўтара

Ападае лісце з яблынь
Маляўніча.
Гэта восень сад азяблы
Ў госці кліча.

Распранае вецер вішні
І налівы.
Дол барвяна-залацістым
Стаў кілімам.

А ў пакоі светла-светла
Ад букетаў.
Будзем золатам асенім
Мы сагрэты.

Мотальскі кажушок

У красуні,
У Ілонкі
Вышываная дублёнка

Па дарозе з Серабранкі
Не дае замерзнуць ранкам.

З вёскі Мотоль кажушок
Ўпадабаў увесь садок.

З выхавацелькай дзяўчаткі
Дружна пляскаюць у ладкі:

Цэлы дзень Ілонкін смех
Гоніць прэч
мароз і снег.

Слімачок

Слімак-слімачок,
Не хавайся ў свой дамок!
Хай падкажуць рожкі
Добрыя дарожкі!

Багоўка

Божая кароўка,
Паляці на неба —
Там твае сяброўкі
Захацелі хлеба.
Аднясі ім дранік —
Будзе сытным ранак.
Сваім любым дзеткам
Аднясі катлеткі,
Сваёй роднай маме —
Торцік
смачны самы.
Нясі свайму тату
Пернік да гарбаты,
Міламу дзядулю —
Спелых грушаў-дуляў,
А бабулі-пані —
Хатніх марцыпанаў!

Алесі

Летнія краскі
Сталі ў збаночак.
Дзіўная казка —
Родны куточак.

Як закувае
Ў лесе зязюля,
Дык прыгадаеш
Песню матулі.

Нібы замову,
Моц і пяшчоту
Бацькавай мовы
Помні заўсёды.

Нашы абрусы —
Кветкі ды птушкі.
Будзь беларускай
Шчырай, дачушка!

«Дзіўна жыць пасля рысы сталасці...»

Сёння нашыя нацыянальныя духоўныя, культурныя і маральныя каштоўнасці — на антрэсолях соцыуму. Асабліва незайздроснае становішча ў правінцыі.

Аднак, як бы насуперак усяму негатыўнаму, сама беларушчына, і літаратура ў прыватнасці, усё ж дарэшты не выміраюць, а штораз — з пакалення ў пакаленне — намагаюцца працягваць справу папярэднікаў. Што тычыцца Берасцейшчыны, то гэтая лінія асабліва заўважная па пераемнасці вядучых постацяў (як, дарэчы, і на Гарадзеншчыне): У. Калеснік — Н. Мацяш — А. Каско (В. Быкаў — А. Карпюк — Д. Бічэль)...

Сёння хацелася б паразважаць над новай кнігай Алеся Каско «Межавыя знакі» (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка», «Кнігазбор», 2014). Я ўжо і не памятаю, калі ён выдаваўся ў сталіцы, ці не ў сярэдзіне 90-х? Паэт, які заявіў пра сябе з першай публікацыі, стаў дастаткова вядомым і самавітым, можна сказаць, да шасцідзесяці гадоў не меў кніжкі сваіх выбраных твораў!

Аднак пра іх — крыху ніжэй. Спачатку — пра самога паэта.

Алесь — з Палесся. З Чудзіна, што на Ганцаўшчыне. Выйшаў, можна сказаць, у свет з самага эпіцэнтра беларускай маці-прыроды... Менавіта там запісваў Сержпутоўскі казкі палешукоў. І менавіта ў мясцовай сярэдняй школе яму пашчасціла адчуць уздзеянне на сабе першага паэтычнага «стымулятара» — слыннага цяпер, а тады апальнага паэта-бадзяжніка Міколу Купрэева, які ня доўга спрабаваў выкладаць яму азы літаратуры... З прыцягальнага балотнага паху, з хісткай багністай засцярожанасці, з прысушанасці і спрамленасці дарог і сцежак паляшуцкай долі — вось адкуль, засмоленае на сумленні і шчымлівай нервовай ноце, самотнае паэтычнае слова Алеся Каско.

Калі разабрацца, дык мог бы пазбегнуць
багністага шляху, дзе тхлом аддае...
Няхай не была непазбежнаю бездань —
я штосьці свіатальнае вынес з яе.

Паэт — дзіўная з'ява. І што ні імя, калі яно насамрэч вартае паэзіі, то непаўторны ўзор чалавечай натуры. Вытанчанай і... гіблай у сваёй недасканаласці... А. Каско не давялося пераадольваць на сваім літаратурным шляху нейкія адміністратыўныя бар'еры. Яго талент не ганьбілі, не тапталі і не замоўчвалі. Тут ён сам кіраваўся ім. І талент не здрадзіў і не падвёў. Можна сказаць, што ўвесь час гэта была хада ў гару, у пад'ём... Цяжкая, знясільваючая, з перапынкакі-роздыхамі...

Тым больш, што разам з душой і духам трэба было ўздымацца і ўсяму грэшнаму-цялеснаму. Вось тут праблемы раз-пораз узнікалі. Правільней сказаць, адсюль і ўзнікалі. Таму што быт і быццё, душа і дух былі непадзельнымі, але не мелі гармоніі. У пошуку яе і цягнулася «вар'яцкае жыццё творцы». І чым вышэйшым быў накал барацьбы і часцейшымі спробы замірэння, тым большая паэтычная энергія выпрацоўвалася вонкі (у свет, да чытача). А паколькі чытач, па сутнасці, быў адсутны, то паэт немінуча патрапляў у сіло самотнай адзіноты. Разваг, вершаў і запісаў на гэты конт у А. Каско, магчыма, нават больш, чым тое вымагала. Тут і настальгія па вытоках, той Прыродзе, якая спарадзіла і пусціла ў свет, і туга па няспраўджаным каханні, і — край веры, за якім пачынаецца і недавер і зняве р'е ўвогуле ва ўсім, што абяцалася на самым пачатку і амаль страцілася на самым канцы жыцця...

О лёс мой, выказацца дай,
не забяры мяне заўчасна
ў далечу тую, дзе так часта
мне будзе сніцца родны край.

Неверагодна, але гэтыя сённяшнія радкі паэта былі напісаны ім ажно трыццаць пяць гадоў назад, у далёкім 1979-м, калі яму было толькі дваццаць восем... Я хачу гэтым сказаць, што паэты выспяваюць дзесьці паміж васямнаццаццю і трыццаццю пяццю, бо пасля трыццаці сямі так ці інакш Паэты заканчваюцца (смерцю фізічнай альбо творчай) па сваёй боскай прызначанасці і прызванасці. Прыкладаў колькі хочаце, хоць дастаткова і выключэнняў. Бо як піша Каско ў вершы «Недажын»:

Як бы доўга ні жыць — не дажыць
да канца... Зноў і зноў паўстае перад намі
грыўка спелых жытоў — недажын,
што асыплецца ветрам, прыб'ецца
дажджамі.
От бы ўсё — ад зярнят да расы —
зберагчы і напоўніцу ўсім наталіцца!
Дакахаць, дапісаць... Папрасіць
даравання ва ўсіх, з паміраннем змірыцца.
....
О, каб гэтак! Але да мяжы
часу меней нашмат, чым да зжатага жыта.
Можна загадзя ўпасці, не жыць...
Ды з таго і жывём, што жывём недажыта.

Самота і адзінокасць — вось вырак паэта. Прычым яна можа падсцерагаць яго паўсюль і заўсёды — у шумнай кампаніі і за вясельным сталом — там, дзе надарыцца пасыл да натхнення і творчасці і супрацьпастаўлення сябе свету. Паэт не можа пазбегчы гэтага наканавання. Больш за тое, ён сам падсвядома і арганізоўвае і стварае незразумелую іншыміі атмасферу сваёй вырачанасці. У гэтым сэнсе збоку паспалітага люду ён бачыцца калі не юродзівым, дык, у лепшым выпадку, дзіваком ці вар'ятам... Што і казаць, калі нават у вершы пра чыста лірычныя адценні душэўных узаемаадносін праступае той самы «сумасшедший с бритвою в руке»:

Дрыготкія рукі твае
ўсплываюць пяшчотай,
і голасам скрыпкі пяе
твая адзінота.
....
І пальцы на кожнай струне
то горка, то горда
пяшчотай не скрыпцы, а мне
сціскаюць горла.

Вершаў такой тэматыкі нямала («***Асляплены ясным прыцемкам...», «***Сёння ў нас выпаў першы снег...», «Навагодняе сола»), а таксама навэлы «Паэты», «Чалавек-сланечнік», «На ланцугу»... Цікавая развага на гэты конт у мініяцюры «Тройчы прачнуцца». Аўтару сніцца, нібыта ён вяртаецца на сцежку маленства, але там яго сустракае стары, нечым падобны на яго самога «заўтрашняга-паслязаўтрашняга».

Глыбока пра сутнасць чалавечай самотнай самасці і яго пакінутасці гавораць строфы гэтага верша:

Самота — на вяршыні дзён самота,
дагэтуль імітацыя была:
ты цемрай заваражваўся, а ўпотай
душа шчымела ў шчылінцы святла.
....
З нязведаных, адчужаных вытокаў
прыйшла самота існаю такой,
нібы ступіў ты ў цесны дом без вокнаў
і дзверы зачынілі за табой.

(Адарваў ад кампутара тэлефонны званок Л. Дранько-Майсюка... На яго традыцыйнае пісьменніцкае пытанне «над чым працуеш?», адказаў, што разважаю над новай кніжкай А. Каско... «О, гэта паэт! Тут табе не давядзецца нічога прыдумляць, ёсць пра што пісаць і трэба... Вось, паслухай, я тут занатоўваю ўпадабаныя вершы...» І чытае мне верш Алеся. «Абавязкова ўпомні пра яго ў сваёй рэцэнзіі», — дадае...

Перачытаў гэты верш яшчэ раз у кніжцы. Вельмі глыбокі ўнутраны голас зямной чалавечай сутнасці. Цытую:

Няшчырыя мы нават у канцы,
калі ў жалобе тоўпімся над мёртвым,
калі канонам непахісным, цвёрдым
вядуць хаўтурны спеў над ім айцы.
Скрыпіць аркестр натомленым акордам,
а мы, на цёплую слязу скупцы,
уласныя сардэчныя рубцы
перабіраем у маўчанні гордым.
Усцешна: размінуліся з чаргою,
не роўня нам паніклы галавою,
хто і прапойцам слыў, і хліпаком!..
Ды ён, калі б ажыў хоць на хвіліну,
сам пляскаў бы вечкам дамавіну
і сам, каб мог, прысыпаўся б пяском».)

У А. Каско няма перыферыйных комплексаў, аднак ёсць, хоць і прыхаванае, але заўважнае кляймо правінцыйнай самакрытычнасці... Ён не працаваў ні ў калгасе, ні на заводзе, не бамжаваў і не жабраваў...

Мы ўсе — адзінкі, непаўторнасць,
ды ўсе — па купцы, па гуртку,
нам доляй — шэрая саборнасць:
палын, запалкі ў карабку.
....
Па аднаму ўсе мы — пылінка...
Ды вось жа — воляю чыёй? —
з'яўляецца між нас адзінка
і паўстае над грамадой.

І вельмі цікава на супрацьпастаўленні чытаецца наўслед страфа з іншага верша:

У роспачы ўздымаеш рукі
і рызыкуеш — бачыць Бог, —
сваім народам збітым з ног,
ляжаць на ўледзянелым бруку.

Прыхільнікам краснага пісьменства асабліва раіў бы засяродзіцца на такіх адмысловых вершах паэта, як «Вока», «Бяссонне», «Балада берага», «Недажын», «***Звіняць і травы ўсе, і дрэвы — Спас...», «***Падаюць яблыкі. Яблыкапад...», «Янка Купала. Пецярбург, 1913», «***Было. Не вярнуць. Ды ніколі не сцерці...», «Навагодняе сола»...

Сама кніжка, апроч удалага мастацкага афармлення, вельмі добра скампанаваная: вершы, проза, дзённікавыя запісы — метафара, мастацкі расповед, літаратура факта.

Даволі змястоўны раздзел прозы, але падрабязна на ім прыпыняцца не буду, бо лічу Алеся паэтам, а гэтыя тэксты працягам ці недапраяўленым негатывам яго няспраўджаных вершаваных задум. Асобныя мініяцюры вельмі блізкія да яго верлібраў («Зямное», «Нежывы», «Бядняк», «Падаўка», «Жанчына»). Зачапіўшыся за іх, коратка адцемлю ўласнае меркаванне: асобным свабодным вершам Каско адчувальна не хапае экспрэсіі, сюжэтнай напружанасці і нервова-псіхалагічнай стыхійнасці (пэўнай драматычнай дзеі), яны скіраваныя больш на адцягнута філасофскі альбо ўедлівы надзённы роздум, чым на лірычнае мастацкае ўзрушэнне.

Сама ж арыгінальная навелістыка паэта нярэдка мае эскізны характар прыпавесці, у якой ёсць адчуванне быкаўскай трагічнасці з глыбокім псіхалагічным перажываннем беспрасветнай сітуацыі («Чалавек-сланечнік», «Цень апазнаць», «На ланцугу», «Роска...»), а часам яна нагадвае захапляльны, скроены ў прыгодніцка-фантастычным стылі расповед Яна Баршчэўскага, таемна ўкрыты туманам той жа беспрасветнасці («Апошні ваўкалак»)... Але ва ўсіх апавядах А. Каско, нават у немачных момантах двойчы згаданай беспрасветнасці, пакідаецца прывіднае святло апошняй чалавечай надзеі на ўдачу, дабро і справядлівасць. Асабліва гэта адчуваецца ў сюжэтна вывераннай навеле «Хата»...

Пасля напоўненых унутраным драматызмам вершаў А. Каско яшчэ больш пераконваешся ў мастацкай шчырасці аўтара, калі пачынаеш чытаць яго «Чудзінскі дзённік». Здавалася б, нічога ў тых запісах асаблівага няма: будзённая канстатацыя бытавання-перажывання чалавека ў вясковай бацькоўскай хаце... Асаблівага напраўду няшмат, а вось асабістага і асабовага дастаткова, каб зацікаўлены чытач мог паралельна выстройваць свой светапогляд і стварыць сваю настальгічную атмасферу па «уходящей натуре»... Увесь гэты паляшуцкі боль А. Каско (па сутнасці — трагедыя ўсяго краю) мне знаёмы і зразумелы, як адкрытая і крываточная рана ўласнай душы. Думаю, падобныя асацыяцыі ўзнікнуць і ў пераважнай большасці чытачоў. Увогуле сіратлівая балючасць гэтай таленавітай кніжкі аддаецца ў маёй істоце яркім пранізлівым азарэннем свядомаснага сумлення- (сумнення): я есмь человек-(?)...

Таму, калі падводзіць пэўную рысу пад лепшымі тэкстамі створанага А. Каско цягам усёй яго — трыццацігадовай — літаратурнай працы, то ў мяне высноўваецца даволі высокая яе ацэнка. Асабліва тое бачыцца на фоне берасцейскага пісьменніцкага згуртавання, дзе, пасля сыходу Ніны Мацяш, яго творчая і грамадзянская асоба на сёння з'яўляецца вызначальнай. Не кожнаму творцу ўдаецца — крывёй, потам і духам, як бы гэта рытарычна ні гучала — так узвышана паказаць перыпетыі драматычнага жыцця роднага беларускага краю, вобразна тонка вымаляваўшы някідкія паляшуцкія рысы яго герояў, захаваўшы іх гонар і годнасць у пластах падтэксту, — і праз гэта, прадзіраючыся скрозь жаль душэўны і боль фізічны, выказаць тым самым і самога сябе... Паэта. Алесю Каско гэта ўдалося. «А болей... Што ж там болей// жадаць ад песняра?!», як пісаў наш нацыянальны прарок. Хіба што далейшага плёну...

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Новы раман Паўло Каэльо



Вядомы і папулярны сучасны аўтар нарэшце выпусціў новы раман пад назвай «Адзюльтэр».

Бразільскі пісьменнік і паэт Паўло Каэльо праславіўся на радзіме яшчэ напачатку 90-х, калі выйшлі яго першыя раманы-хіты «Алхімік», «Вераніка вырашае памерці» і «Кніга ваяра святла». Да нашай чытацкай аўдыторыі яго літаратурны здабытак дакаціўся толькі ў нулявых, пасля з'яўлення досыць адкрытай кнігі «Адзінаццаць хвілін», якая апісвае лёс прастытуткі. Наступныя кнігі былі ўспрыняты паранейшаму захоплена, хоць і былі меней скандальнымі і «вострымі». Філасофскі падтэкст, эмацыйны стыль і небанальныя сюжэты — што з гэтага менавіта «зачапіла» чытачоў, не так важна, пэўна можна сказаць, што сёння яго кнігі раскупляюцца мільённымі накладамі і нязменна перакладаюцца на 112 моў свету.

Назва «Адзюльтэр» у перакладзе азначае «шлюбная здрада», уласна гэта і ёсць галоўная тэма новага твора Каэльо. Сам аўтар так апісвае прадмет свайго вывучэння: «Шлюбная здрада — гэта адна з тых рэчаў, якую, як паказвае статыстыка, робіць у сваім жыцці кожны трэці... І гэта далікатная тэма будзе існаваць, пакуль існуе інстытут шлюбу. Колькі пар развялося з-за таго, што не змаглі пераадолець гэты складаны момант. Спачатку я не планаваў пісаць кнігу, я толькі хацеў правесці анлайн-дыскусію, але потым сеў, у мяне ў галаве з'явілася ідэя — і я пачаў пісаць. Кніга атрымалася нібы падвешанай у паветры, і яна запрашае вас да адкрытага абмеркавання гэтай тэмы».

Галоўная гераіня 30-гадовая Лінда ўсведамляе, што, нягледзячы на дабрабыт і шчасце, яе жыццё насамрэч пустое і бязрадаснае. Яе гняце аднастайны сямейны быт, непераборлівае палавое жыццё з мужам і бясконцая балбатня ды хвальба з сяброўкамі. У пошуках «запалу жыцця» яна знаходзіць суцяшэнне ў абдымках былога палюбоўніка, але ці выйсце гэта?

Такое пытанне і задае аўтар...

«Бясколерны Цукуру Тадзакі...»

На ангельскай мове выйшаў «Бясколерны Цукуру Тадзакі і гады яго падарожжаў» — новы раман культавага японскага празаіка Харукі Муракамі.

Кніга ўжо стала бэстсэлерам Японіі. «Бясколерным» новага героя Муракамі — 36-гадовага інжынера — абзываюць чатыры сябрукі, у прозвішчах якіх сустракаецца іерогліф колеру. Яны — «чырвоны», «сіні», «белы» і «чорны». «Яго асобе бракавала яркасці ці хоць бы чаго-небудзь, што б яго вылучала», — рэзюмуе аўтар. Неўзабаве «каляровыя» парываюць усякія зносіны з «бясколерным», які пакідае родны горад і паступае ва ўніверсітэт у Токіа. Пасталеўшы, герой адпраўляецца ў вандраванне, каб пераадолець унутраную пустэчу і пачуццё адзіноты ды зразумець, чаму ён не змог захаваць сяброўства са сваімі таварышамі.

Шматгадовы намінант на Нобелеўскую прэмію па літаратуры Харукі Муракамі стаў вядомы кнігай «Паляванне на авечак», за якой былі «Нарвежскі лес» і «Кафка на пляжы». Кнігі японскага аўтара перакладзены на сорак моў свету. Наклад яго «Бясколернага...» у Японіі склаў 1,5 мільнаў асобнікаў, аднак да канца першага дня продажаў выдавецтва заявіла, што дадрукоўвае яшчэ 100 тысячаў кніг. Па хуткасці продажаў раман ужо абагнаў папярэднюю кнігу пісьменніка «1Q84».

У «Бясколерным...» у Муракамі зноў з'яўляецца герой-пустэльнік, які, здаецца, знаходзіцца ў сваяцтве з Ёзэфам К. з рамана Кафкі «Працэс». Той быў асуджаны невядомымі сіламі за злачынства, якога не здзяйсняў. Пакараннем для героя Муракамі становіцца яго адзінота — праз тое, піша Муракамі, герой жыве «практычна адной толькі думкай пра смерць». «Бясколерны» тут — колер смерці. Вялікую частку апавядання займае пошук прычынаў адчужэння, на якое яго выраклі сябры.

Крытыкі адзначаюць, што на гэты раз Муракамі замест містыкі звярнуўся да агульначалавечых праблем: яго герой, пачуццёвы падлетак, пасталеўшы, спрабуе скінуць з сябе навязанае звонку пачуццё віны за ўласнае жыццё.

Адной з цэнтральных сцэнаў становіцца эратычны сон «бясколернага», у якім ён бачыць сябе з жонкамі «каляровых» сяброў, разважае пра прыхаваную бісэксуальнасць і некрафілію.

Уплятаючы гэтыя падтэксты ў раман, Муракамі даследуе адваротны бок маральнасці.

У вандроўцы «бясколерны» сустракае двух павадыроў. Адзін з іх адкрывае яму глыбіню класічнай музыкі (галоўнай музычнай тэмай рамана Муракамі робіць фартэпіянны цыкл «Гады падарожжаў» Ліста), другі — прымушае знайсці «каляровых» сяброў дзеля таго, каб псіхалагічныя школьныя траўмы героя нарэшце зацягнуліся.

На ангельскую мову кнігу пераклаў прафесар Філіп Гэбрыэл з Арызонскага ўніверсітэта.

Прэмія «Аляксандр Неўскі»

Вячаслаў Бандарэнка, мінскі пісьменнік, стаў лаўрэатам X Усерасійскай гісторыка-літаратурнай прэміі «Аляксандр Неўскі». Характэрна, што ўпершыню ў гісторыі ўзнагароды прэмію ў юбілейным сезоне атрымаў не жыхар Расіі.

Гісторыка-літаратурная прэмія «Аляксандр Неўскі» была ўручана В. Бандарэнку за кнігу «Героі Першай сусветнай», якая выйшла ў выдавецтве «Молодая гвардия». Выданне складаецца з 12 нарысаў, прысвечаных выдатным асобам, якія вызначылі ход Першай сусветнай вайны — ад радавых салдат да вярхоўных галоўнакамандуючых. Выданне было ўпершыню апублікавана ў серыі «ЖЗЛ» у 2013 годзе, а праз год — перавыдадзена.

Лаўрэата ўзнагароды ў гэтым годзе выбіралі з 220 намінантаў. На ўрачыстай цырымоніі ўручэння гісторыка-літаратурнай прэміі, якая прайшла ў Санкт-Пецярбургу, В. Бандарэнка сказаў: «Нізкі паклон маім героям — людзям, якія сумленна і адважна выканалі свой абавязак стагоддзе назад, людзям, якія ведалі пра тое, што слова«Радзіма»заўсёды пішацца з вялікай літары». Перамогу ў конкурсе ён прысвяціў роднай Беларусі, дзе кніга была задумана.

Шрыфт Тараса Шаўчэнкі

У Нацыянальным музеі Тараса Шаўчэнкі адбылася прэзентацыя ўнікальнага праекта «Kobzar KS», створанага пры падтрымцы Міністэрства культуры Украіны.

Адзначаючы 200-ю гадавіну з дня нараджэння знакамітага ўкраінскага пісьменніка і мастака, «Кіеўстар» стварыў першы ў свеце шрыфт, які цалкам аднаўляе почырк Кабзара.

Праект адкрывае новы погляд на творчую спадчыну ўкраінскага паэта з дапамогай сучасных тэхналогій. Натхненнем для стварэння праекта стаў арыгінальны кампутарны шрыфт «Kobzar KS», распрацаваны на аснове почырку Т. Шаўчэнкі.

Кожны жадаючы зможа пратэставаць афіцыйны сайт шрыфта, які дазваляе ствараць плакаты і футболкі, а таксама пісаць лісты почыркам украінскага нацыянальнага генія.

Суд і «Маленькі прынц»

Суддзя ў Аргентыне абавязаў пару, якая сабралася скасоўваць шлюб, прыходзіць раз у тыдзень разам з дзецьмі ў залу суда і чытаць кнігу Антуана дэ Сэнт-Экзюпеpы «Маленькі прынц».

А таксама паводле таго ж выраку яны мусяць агучваць тэкст «Канвенцыі пра правы дзіцяці» і кнігу іспанскага філосафа Фернанда Саватэра «Этыка для Амадора».

Суддзя ўпэўнены, што гэта дапаможа бацькам наладзіць кантакт з дзецьмі: яны, мяркую, «змогуць лепш іх зразумець і ўбачыць у кожным асобу, што з'яўляецца мінімальна неабходнай умовай для іх выхавання і адукацыі».

Чытанне кніг, у прыватнасці «Маленькага прынца», адбываецца пад наглядам судовага супрацоўніка. Калі ж хтосьці з бацькоў вырашыць адмовіцца ад ускладзенага на яго абавязку, суддзя можа прыняць рашэнне даставіць іх да месца для чытання кніг з дапамогай сілаў правапарадку.

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў The Guardian, Gazeta.ua, The Bookseller, BBC, Associated Press, vsiknygy.net і prostokniga.com.ua.

Пісьменнікі супраць «Amazon»

Пісьменнікі, якія падтрымалі выдавецтва «Hachette» ў зацяжным канфлікце (аб умовах кантракта з інтэрнэт-рытэйлерам «Amazon»), аб'ядналіся ў арганізацыю «Authors United».

У аб'яднанне ўвайшлі 12 аўтараў, сярод якіх Лі Чайлд, Джэфры Дзівер, Дэвід Балдаччы, Стывен Кінг, Джэймс Патэрсан і Донна Тарт.

«Authors United» створана па ініцыятыве амерыканскага пісьменніка Дугласа Прэстана, які ў чэрвені 2014 года распаўсюдзіў ліст да прэзідэнта кампаніі «Amazon» Джэфа Безаса з патрабаваннем урэгуляваць канфлікт з «Hachette», які «блакуе і затрымлівае продаж кніг». Гэты ліст падпісалі аўтары, якія ўвайшлі ў «Authors United».

Сваю задачу новае аб'яднанне пісьменнікаў бачыць у распрацоўцы доўгачасовай стратэгіі супрацьстаяння «Amazon» у выпадку, калі патрабаванні, выкладзеныя ў лісце, не будуць задаволены.

Адказам «Amazon» на прэтэнзіі пісьменнікаў была прапанова выплаты аўтарам «Hachette» 100 адсоткаў коштаў з продажу электронных кніг. Пакуль ідуць перамовы паміж выдавецтвам і крамай. Іншымі словамі, аўтары маглі атрымліваць усё тое, што зарабляюць з продажаў абодва бакі.

У сваю чаргу, група з 27 незалежных пісьменнікаў апублікавала петыцыю ў падтрымку «Amazon». Дакумент падпісала больш сямі тысячаў чалавек.

«Amazon.com, Inc.» — найбуйнейшая ў свеце амерыканская кампанія па продажы тавараў праз Інтэрнэт і адзін з першых інтэрнэт-сэрвісаў, арыентаваных на продаж тавараў масавага попыту. Кампанія «Amazon.com» была створана ў 1994 годзе амерыканскім прадпрымальнікам Джэфам Безасам, а ў 1995-м быў запушчаны сайт. Кампанія была названа ў гонар ракі Амазонкі, самай паўнаводнай у свеце. Першапачаткова на сайце прадаваліся толькі кнігі. У 1998 годзе крама пачала прадаваць музычныя дыскі і відэапрадукцыю. Пазней у асартыменце з'явіліся MP3-запісы, праграмнае забеспячэнне, відэагульні, электроніка, вопратка, мэбля, прадукты харчавання і цацкі.

Свой першы працоўны стол заснавальнік «Amazon.com» склаў са старых дзвярэй. Сёння ў кампаніі некаторыя сталы таксама зроблены з дзвярэй — каб нагадваць пра неабходнасць эканоміі.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by